

ГІСТОРЫЯ МОЦНАГА БЕЛАРУСА ІОСІФА ХОДЗЬКІ **9**

МЯНЯЕМ «СУМНЫ» РАЦЫЁН НА «РАДАСНЫ». **11**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 СТУДЗЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 14 (29383)


**ЛІЧБА ДНЯ**

**Br1474,6**

*склала намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў снежні 2020 года. У разрэзе рэгіёнаў традыцыйна лідзіруе сталіца: сярэдняя зарплата ў снежні дасягнула Br2151,2 (тэмп росту да снежня мінулага года — 114,3 %). У Мінскай вобласці сярэдняя зарплата склала Br1427,1 (107,2 %), Брэсцкай — Br1289 (107,4 %), Гродзенскай — Br1274,7 (110 %), Гомельскай — Br1263,4 (108,8 %), Віцебскай — Br1213,7 (109,3 %), Магілёўскай — Br1176 (109,9 %). Больш за ўсё ў снежні атрымлівалі работнікі такіх сфер, як інфармацыйныя тэхналогіі і дзейнасць у галіне інфармацыйнага абслугоўвання (Br6270,3), дапаможная дзейнасць у сферы фінансавых паслуг і страхавання (Br4426). Менш за ўсё налічана работнікам цырульняў і салонаў прыгажосці (Br672,3), сферы творчай дзейнасці і забаў (Br842,7), работнікам бібліятэк, архіваў, музеяў і іншых устаноў культуры (Br793,3).*

# Птушкі на шчасце



Традыцыі аздабляць аконныя ліштвы сімваламі ў выглядзе птушак у Беларусі не менш за сто гадоў, але і ў наш час знаходзяцца апантаныя майстры, якія ўпрыгожваюць фасады сваіх дамоў арыгінальнымі матывамі, шануюць родныя традыцыі. У вёсцы Лучнікі Слуцкага раёна на вуліцы Рабочай стаіць дом на дзевяць акон, над якімі «жывуць» птушыныя сем'і. Над кожным — па чатыры птушачкі, а ўвогуле — трыццаць шэсць. Цэлая чарада! Сам дэкор ліштваў мае сіметрычную і сэнсавую кампазіцыю: у цэнтры — дзве птушкі, а па краях — па адной. Мне пашчасціла пазнаёміцца з гаспадаром і аўтарам персанальнага праекта пад назвай «дом з птушкамі». Мікалай КЛЕВАНОВІЧ — з сялянскай лучнікоўскай сям'і, працаваў слесарам электраабсталявання, цяпер на пенсіі. Будоўляй дома ён займаўся сам. У семдзесят дзявятым сям'я справіла наваселле. Доўгімі зімовымі вечарамі габляваў і выпільваў кожную птушачку, кожную кветачку, падбіраў фарбы, размалёўваў, а праз год прыбіў апошнюю ліштву. На маё пытанне, чаму абраў менавіта гэты арніталагічны дэкор, Мікалай Фёдаравіч адказаў надзвычай проста: «Мае галубы сімвалізуюць сямейную ідылію, радавое гняздо, любоў і шчасце, бо тут і птушкі-бацькі, і птушаняты-дзеці. Не паверыце, яшчэ да школы я марыў, што ў мяне будзе свой дом, вялікая гаспадарка і двое дзяцей. У нашай сям'і нарадзіліся двое дзяцей, цяпер гадуюцца пяцёра ўнукаў і нават праўнучка. Хто яго ведае, магчыма птушачкі на вокнах спрыялі нашаму сямейнаму дабрабыту?»

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**КОРАТКА**

- **Аб'ём уводу жылля ў Беларусі ў 2020 годзе павялічыўся на 2,3 %.**
- У нашай краіне пачалася комплексная праверка баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці Узброеных Сіл.
- **У Беларусі ў 2020 годзе перапахаваны астанкі 878 загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.**
- Замежныя прафсаюзы асуджаюць рашэнне ЕС аб увядзенні санкцый у дачыненні да беларускіх прадпрыемстваў.
- **Узровень занятасці беларусаў у кастрычніку—снежні 2020 года склаў 67,9 %.**


ISSN 1990 — 763X

21014


Перспектыва

## З УЛІКАМ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ



**Сёння ў краіне актыўна абмяркоўваецца праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. Прапановы фарміруюцца ва ўмовах дыскусійных пляцовак, грамадскіх прыёмных, адкрытых дыялогаў з народам. На шостым Усебеларускім народным сходзе будзе дэталёва разгледжаны гэты дакумент. З якімі пасыламі, спадзяваннямі, надзеямі выступае Магілёўшчына? Якія асноўныя паказчыкі і параметры закладвае яна ў сваю рэгіянальную праграму развіцця на будучыя пяць гадоў? Пра гэта ў нашай гутарцы з намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама Русланам СТРАХАРОМ.**

**СТАР. 5**

Фінансаванне: куды і колькі?

## КАБ НЕ «ПЛАДЗІЦЬ» ДАЎГАБУДЫ

Інвестпраграма сталіцы ў гэтым годзе на 20 % «таннейшая», чым у папярэднім

**Так, гэта факт — аб'ёмы фінансавання інвестыцыйнай праграмы Мінска на бягучы год значна меншыя, чым на 2020-ы. Пра гэта паведаміла старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА.**



### ШКОЛА, САДКІ І МЕТРО

За папярэдні год сталіца практычна асвоіла ўсе 100 % праграмы, або 924,1 мільёна рублёў. За гэты час быў забяспечаны ўвод у эксплуатацыю чатырох станцый метро («Кавальская Слабада», «Вакзальная», «Плошча Францішка Багушэвіча», «Юбілейная плошча»), а таксама інжынерны корпус. Пабудавана школа ў мікраёне «Каменная Горка-3» і пасля рэканструкцыі здадзены спецыялізаваны ліцэй МУС.

**СТАР. 7**

З першых вуснаў

# «Беларусы павінны атрымаць дадатковыя магчымасці, а не праблемы»

## Персанальныя даныя пры ўвядзенні біяметрычных дакументаў будуць надзейна абаронены

**На гэта падчас нарады па пытаннях увядзення біяметрычных дакументаў звярнуў асаблівую ўвагу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

Па словах кіраўніка краіны, работа над укараненнем новага віду дакументаў вядзецца ўжо даўно і цяпер урад, службовыя асобы інфармуюць яго, што ўсё гатова: сфарміраваныя інфармацыйныя сістэмы, неабходнае абсталяванне закуплена, праведзена растлумачальная работа з насельніцтвам.

«Можна хоць заўтра выдаваць ідэнтыфікацыйныя карты і новыя пашпарты. Трэба толькі стварыць неабходнае прававое рэгуляванне, падпісаўшы адпаведны ўказ. **Зразумела, калі мы ў грамадства, эканоміку ўводзім нешта новае, неабходныя адпаведныя прававыя нарматыўныя дакументы.** Парадак павінен быць», — сказаў Прэзідэнт.

Як ён адзначыў, укараненне біяметрычных дакументаў павіннна паслужыць штуршком для развіцця электронных паслуг, скараціць час на здзяйсненне шэрагу працэдур, павысіць абароненасць дакументаў ад падробак.

Прэзідэнт звярнуў увагу: добра, што ў краіне развіваюцца электронныя паслугі. Але выказаў сумненне наконт таго, што біяметрычныя дакументы больш абароненыя ад падробак.

«Таму я і вырашыў у сілу пэўных прычын разглядзець у больш шырокім коле з зацікаўленымі распрацоўшчыкамі праект указа, які рэгуляваў бы парадак ва ўкараненні біяметрычных дакументаў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Ёсць вялікія сумненні, і не толькі ў мяне, але і ў грамадзян. Вы памятаеце на тым этапе, калі мы толькі пачалі пра гэта гаварыць, і грамадскія арганізацыі, і асобныя людзі выступілі катэгарычна супраць гэтага. Таму даводзілася ўзяць нейкі таймаўт, каб мы сур'ёзна папрацавалі над гэтым пытаннем».

Паводле слоў кіраўніка краіны, мяркуецца, што згаданае новаўвядзенне закране абсалютна ўсіх, але пры гэтым **«беларусы павінны атрымаць дадатковыя магчымасці, а не праблемы»,** нельга выпускаць з-пад увагі цяжкасці, з якімі могуць сутыкнуцца людзі і арганізацыі пры атрыманні новых дакументаў і іх далейшым выкарыстанні.

«Мне важна пачуць, што ўсе арганізацыйныя і тэхнічныя нюансы ўлічаныя. Ці не створым мы перашкод для рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў, ці забяспечым абарону іх персанальных даных. Гэта мяне больш за ўсё насцярожвае, бо на цяперашнім этапе нават двойку нельга вам паставіць па ахове персанальных даных. Ці не атрымаецца, што мы нахамутаем яшчэ адну праблему, па-народнаму кажучы», — задаў пытанні прысутным на нарадзе кіраўнік ведамстваў і структур Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пацікавіўся, ці трэба ўводзіць біяметрычныя дакументы з 30 красавіка, як прапануе ўрад, або патрабуецца яшчэ час для падрыхтоўкі?

**«Усе пытанні трэба старанна адпрацаваць да пачатку выдачы новых дакументаў.** Каардынатарамі гэтай маштабнай дзейнасці выступаюць МУС і Міністэрства сувязі. Калі ёсць якія-небудзь праблемы, яны павінны быць агучаны», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Даведка

Біяметрычныя дакументы прадстаўлены ў двух відах. На замену звычайнаму папяроваму пашпарту прадугледжаны ўнутраны дакумент — ID-карта, а для паездак за мяжу плюс да яе прыйдзецца займець і біяметрычны пашпарт. ID-карта — дакумент выключана для ўнутранага выкарыстання, які ўяўляе сабой пластыкавую смарт-карту з інтэгральнай мікрасхемай. На яе нанесены фатаграфія і асноўныя даныя ўладальніка (імя, дата нараджэння, грамадзянства, пол, асабісты нумар, тэрмін дзеяння дакумента і подпіс). Астатнія звесткі размясцяцца ў дзяржаўных інфармацыйных сістэмах і рэсурсах. Біяметрычны дакумент для выезду і ўезду мае выгляд пашпартнай кніжкі з інтэгральнай мікрасхемай, якая змяшчае электронны сродак біяметрычнай ідэнтыфікацыі. Для выкарыстання новых відаў дакументаў распрацавалі Беларускую інтэграваную сэрвісна-разліковую сістэму (БІСРС).

Пасля канчатковага ўкаранення біяметрычных дакументаў няма неабходнасці атрымліваць іх замест прывычнага пашпарта. Папяровы варыянт дакумента будзе сапраўдны да тэрміну яго заканчэння.

### Каментарый у тэму

**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў Беларусі,** паведаміў журналістам пасля нарады, што ведамства, якое яму падначалена, гатова да выдачы новага віду дакументаў.

«Звярталася ўвага на зручнасць для насельніцтва пры атрыманні, выкарыстанні біяметрычных дакументаў, — дадаў Іван Кубракоў. — Мы далажылі Прэзідэнту пра ахову персанальных даных, і ён згадзіўся з тым, што сёння тэхнічна прыватныя даныя абаронены».

**Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі,** паведаміў, што тэхнічная сістэма для ўвядзення біяметрычных дакументаў у высокай ступені гатоўнасці, але пытанне, на якім засяродзілі ўвагу на нарадзе, — зручнасць навацый для насельніцтва.

«Калі вы не захочаце пераходзіць на новыя дакументы, вы павінны мець магчымасць са звычайным пашпартам атрымліваць тое, што прадугледжана (ID-картай. — **«Зв.»**)», — сказаў міністр.

Наконт тэрмінаў выдачы Канстанцін Шульган адзначыў: усе ведамствы зацікаўлены скончыць работу ў самы кароткі час. Прапануецца варыянт запуска сістэмы з ліпеня.

Міністр дадаў, што старыя пашпарты будуць мець сілу да сканчэння тэрміну дзеяння. «Напрыклад, ваш стары пашпарт патрабуе замены. Вы прыходзіце, атрымліваеце ID-карту як унутраны пашпарт, а калі плануеце выезд за мяжу, плюс да ID-карты атрымліваеце яшчэ і біяметрычны пашпарт», — тлумачыць Канстанцін Шульган.

Па яго словах, таксама прапрацоўваецца сістэма выдачы новых пашпартоў з біяметрычным чыпам для выезда за мяжу, але каб ён быў пры гэтым юрыдычна дзеючым і ўнутры краіны.

«Каб гэта прадугледзець, трэба вярнуцца да пытання тэхналагічнага. Таму што задумка была — у першую чаргу атрымліваць ID-карту, а да яе біяметрычны пашпарт. А калі грамадзянін хоча атрымаць толькі «кніжачку» (біяметрычны пашпарт для выезду. — **«Зв.»**), трэба разглядзець тэхналогію выдачы. Але аб'ядання дакладна не будзе», — канстатаваў міністр.

Меркаванне

# ПА БЕЛАРУСКІМ СЦЭНАРЫІ



У мінулую нядзелю ў саюзнай Расіі прайшла серыя пратэстаў, арганізаваных несістэмнай апазіцыяй. Нагодай стала затрыманне ў аэрапорце Шарамецьева радыкальнага блогера, «берлінскага пацыента» Аляксея Навальнага. Федэральная служба выканання пакаранняў ставіць у віну Навальнаму парушэнне рэжыму выпрабавальнага тэрміну, які апазіцыянер атрымаў у рамках расследавання крымінальнай справы аб махлярстве.

У сваю чаргу адразу пасля затрымання каманда Навальнага апублікавала на сваім «Ютуб»-канале фільм-расследаванне аб велізарным палацы, які нібыта належыць Уладзіміру Пуціну. І хоць ніякіх прамых доказаў таго, што ўладальнікам палаца сапраўды з'яўляецца Прэзідэнт Расіі ці хоць бы таго, што ён там хоць раз бываў, не было прадстаўлена, фільм за няпоўны тыдзень набраў больш за 85 млн праглядаў.

Менавіта гэты фільм быў выкарыстаны ў якасці інфармацыйнага тарана, які павінен быў прабіць прабоіну ў свядомасці расіян, і вывесці іх на вуліцы з заклікамі звергнуць дзеючую ўладу. Вынік атрымаўся сціплы, хоць у асобных выпадках, напрыклад, у прыморскіх гарадах Уладзівастоку і Санкт-Пецярбургу пратэстоўцы паводзілі сябе агрэсіўна і нападалі на супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

У Маскве акцыя сабрала ўсяго некалькі тысяч чалавек, што для 15-мільённага мегаполіса можа лічыцца хутчэй правалам, чым поспехам. Параўнальна шматлікія пратэсты атрымаліся толькі ў шэрагу сібірскіх гарадоў, што звязана з праблемнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй у гэтых рэгіёнах.

У цэлым хваля пратэстаў, інспіраваных Навальным і яго прыхільнікамі, надзіва нагадвае падзеі ў Беларусі, якія разгортваліся за паўгода да прэзідэнцкіх выбараў у нашай краіне. Тады вядомы польскі тэлеграм-канал, прызнаны сёння экстрэмісцкім, таксама выпусціў фільм у «Ютубе» пра беларускага Прэзідэнта. І мэта была такая ж — настроіць грамадзян супраць улады з-за фэйкавых, нічым не пацверджаных абвінавачанняў.

Пасля выхаду фільма беларусаў таксама заклікалі выйсці на акцыю пратэсту, якая атрымалася даволі нешматлікай. Але гэта быў толькі пачатак. Далей уключылася ўся апазіцыйная медыйная машына, якая шчодра фінансуецца замежнымі куратарамі. Перыяд перадвыбарчай агітацыі быў выкарыстаны дэструктыўнымі сіламі для рэпетыцыі і трэніроўкі супрацьпраўных дзеянняў пасля 9 жніўня.

І цяпер, у Расіі мы ўбачылі тыя ж тэхналогіі расчалавечвання сілавікоў, ужо пайшлі злівы іх персанальных даных, абвінавачанні і ў перавышэнні паўнамоцтваў і празмерным выкарыстанні сілы. Аднак у Расіі ўлічылі беларускі вопыт і можна сказаць, што расійскі АМАП дзейнічаў гіперкарэктна нават нягледзячы на відавочныя правакацыі.

Тым не менш паралелі паміж падзеямі ў суседняй краіне і ў нас далёка не выпадковыя. І справа нават не ў агульным падабенстве тэхналогій, якія ўжываюцца супраць дзяржавы і сілавых органаў. Справа ў агульнасці назначаных цэляў.

Ужо некалькі гадоў вядучыя заходнія «фабрыкі думкі», напрыклад, амерыканская карпарацыя RAND, пішуць падрабязныя даклады аб тым, як лепш стрымліваць Расію і шкодзіць яе саюзнікам. Адным з іх асноўных метадаў амерыканскія аналітыкі ўнутры краіны называюць супрацьпастаўленне ўлады і грамадства, бюракратыі і грамадзян, асабліва ў рамках тэмы карупцыі, незаконнага ўзбагачэння расійскай палітычнай эліты. Менавіта таму апошнім часам літаральна пасыпаліся разнастайныя расследаванні ў дачыненні да вышэйшага ваенна-палітычнага кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі.

Нашым геапалітычным праціўнікам жыццёва неабходна падарваць давер і легітымнасць законнай улады, настроіць грамадзян супраць сваёй дзяржавы і, у рэшце рэшт, аслабіць яе ў міжусобіцах.

На знешнім контуры неабходна біць па саюзніках Расіі для таго каб па ўсім перыметры яе граніц былі не стабільныя дзяржавы, а «гарачыя кропкі», якія выцягваюць значныя рэсурсы і ствараюць доўгатэрміновыя праблемы. Беларусь тут даўно з'яўляецца цэллю для гэтых атак, паколькі адыгрывае вельмі важную стратэгічную ролю на заходнім флангу.

У сувязі з гэтым трэба разумець, што, хутчэй за ўсё, разварушванне пратэснай актыўнасці ў Расіі працягнецца, апагея яна павінна дасягнуць пад выбары ў Дзяржаўную думу, верагодна, працягнецца і пасля іх. Таму ставіцца да яе трэба з усёй сур'ёзнасцю, памятаючы нядаўні беларускі вопыт.

А нам сумесна трэба не толькі не даваць магчымасці аслабіць нашы дзяржавы, але і аператыўна абменьвацца інфармацыяй аб завадатарах супрацьпраўнай актыўнасці, выпрацоўваць уласныя тэхналогіі барацьбы са спробамі арганізаваць «каляровыя рэвалюцыі», своечасова рэагаваць на грамадскія запыты, каб ніхто не мог іх выкарыстоўваць у дэструктыўным ключы. Мы знаходзімся ў адной лодцы і цяпер вельмі важна акуратна, але ўпэўнена кіраваць ёй у той стыхіі, якая разгортваецца перад намі ў новым дзесяцігоддзі.

**Аляксей ДЗЕРМАНТ.**

Факт

# РЭСТАЎРАЦЫЯ ЗАВЕРШАНА

### Новая музейная экспазіцыя «Форт № 5» Брэсцкай крэпасці адкрылася для наведвальнікаў

**Гэта ўнікальны помнік рускай фартыфікацыі канца XIX—пачатку XX стагоддзяў. Форт быў узведзены ў 1879—1880 гадах у якасці аднаго з перадавых умацаванняў крэпасці над Бугам.**

Пасля Другой сусветнай вайны форт доўгі час выкарыстоўвалі як ваенныя склады часцей. У 1990-х аб'ект быў уключаны ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў і стаў філіялам мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

Апошнім часам форт быў закрыты на рэстаўрацыю. Падчас рамонту былі пракладзены інжынерныя сеткі, праведзена добраўпарадкаванне. Дзякуючы праекту Саюзнай дзяржавы ў памяшканнях форта з'явіўся яшчэ адзін музей. Экспазіцыя размясцілася ў казематах былой казармы. Музей складаецца з шасці залаў, прысвечаных гісторыі фартыфікацыі на беларускіх землях, сістэме фартыфікацыі Брэсцкай крэпасці, рамонту і рэстаўрацыі аб'ектаў умацавання. Таксама адноўлены інтэр'еры жылога каземата для ніжніх чыноў арміі, пад музей задзейнічаны і парахавы склеп. А на ўваходзе ў музей з'явілася скульптура салдата-вартавога.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні галоўнаму саветніку экспертна-прававога ўпраўлення сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Святлане Уладзіміраўне Фядотавай у сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Добрая традыцыя

# НА ДУХОЎНАЙ ПАДСТАВЕ

**«Каляднi вечар» мiжнароднага грамадскага аб'яднання «Хрысцiянскi адукацыйны цэнтр iмя святых Мяфодзiя i Кiрылы» стаў ужо добрай традыцыяй. У гэтым годзе ён быў прысвечаны памяцi мiтрапалiта Фiларэта, ганаровага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусi. Менавiта ён быў заснавальнiкам i першым старшынёй хрысцiянскага адукацыйнага цэнтра.**

**Мiжнароднае грамадскае аб'яднанне «Хрысцiянскi адукацыйны цэнтр iмя святых Мяфодзiя i Кiрылы» з'яўляецца грамадскай арганiзацыяй, створанай па iнiцыятыве Беларускай праваслаўнай царквы з мэтай сумеснай рэалiзацыi царкоўна-дзяржаўных, эканамiчных, сацыяльных, культурных i рэлiгiйных iнiцыятываў як на тэрыторыi Рэспублiкi Беларусь, так i iншых краiн. Членамi аб'яднання з'яўляюцца святары i свецкiя людзi, прадстаўнiкi культурнай i навуковай грамадскасцi, кiраўнiкi i супрацоўнiкi ўстаноў адукацыi i аховы здароўя, вытворчых прадпрыемстваў. Кiрункамi дзейнасцi аб'яднання з'яўляецца хрысцiянская асвета, дабрачыннае, сацыяльнае i адукацыйнае служэнне сучаснаму грамадству праз рэалiзацыю i падтрымку розных культурных, адукацыйных, сацыяльных i навуковых праграм.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Цяперашнi форум узначалiў **мiтрапалiт Мiнскi i Заслаўскi Венiямiн:**

— Гэты год у нас абвешчаны Годам адзiнства, i ў калядныя днi мы гаворым пра адзiнства беларусаў на духоўнай падставе. Усё, што мы маем добрага i станоўчага вакол сябе сёння, вызначаецца верай i жыццём нашых бацькоў i прадзедаў, якiя жылi адпаведна з верай хрысцiянскай, прычым з верай жывой i ўвасобленай. Калi ж ёсць нейкiя недахопы, то гэта вынiк нашых памылак i забыцця тых iсцiн, якiя нам перадалi нашы продкi, — упэўнены мiтрапалiт Венiямiн.

У гэтым годзе за асаблiвы ўнёсак у справу хрысцiянскай асветы i адукацыi, дбайнае служэнне Царкве Хрыстовай у справе выхавання моладзi, уклад у развiццё тэалагiчнай адукацыi калядныя прэмii цэнтра ўручаны протаiерэю Андрэю Смольскаму, клiрыку Вiцебскай епархii, кiраўнiку аддзела рэлiгiйнай адукацыi i катэхiзацыi Вiцебскай епархii, а таксама Галiне Нiкалаенка, старшынi грамадскага аб'яднання «Беларускае педагагiчнае таварыства», прарэктару па навукова-метадычнай



рабоце Акадэмii паслядыпломнай адукацыi, прафесару кафедры сучасных методык i тэхналогiй адукацыi, доктару педагагiчных навук.

Завяршыўся «Каляднi вечар» канцэртнай праграмай «Музычнае прынашэнне», арганiзаванай сумесна з Беларускiм саюзам музычных дзеячаў. У канцэрце ўзялi ўдзел заслужаны калектыў Рэспублiкi Беларусь — Дзяржаўная акадэмiчная харавая капэла iмя Рыгора Шырмы пад кiраўнiцтвам Вольгi Янум, мiтрапалiцкi хор Мiнскага Свята-Духава кафедральнага сабора пад кiраўнiцтвам Вiталя Сабалеўскага, а таксама камерны хор Беларускага саюза музычных дзеячаў «Salutaris».

**Наталля ТАЛIВIНСКАЯ.**

Надвор'е

# «Ларс» нясе багатыя ападкi

## Чакаецца моцны вецер, месцамi да 23 м/с

**А ўсё ж такi зiма ў нас вельмi капрызная дама з досыць кепскiм характарам. Вось i на гэтым тыднi чакаецца вельмi няўстойлiвае надвор'е.**
**Згаданы цыклон прынясе ў краiну завеi i парывiсты вецер, паведамляюць спецыялiсты Рэспублiканскага цэнтра па гiдраметэаралогii, кантролi радыеактыўнага забруджвання i манiторынгу навакольнага асяроддзя Мiнпрыроды.**

Паўднёвы цыклон «Ларс» заляцiць да нас у аўторак i «дагасцiць» на тэрыторыю Беларусi даволi складаныя ўмовы надвор'я. Чакаюцца моцныя ападкi ў выглядзе снегу, мокрага снегу i нават дажджу амаль па ўсёй тэрыторыi краiны. Найбольш iстотны прырост снежнага покрыва (да 15—20 см) будзе на захадзе краiны. Цыклон прынясе з сабой густыя туманы, а на асобных участках дарог магчымая галалёдзiца. Удзень у аўторак у многiх раёнах краiны будзе ўзмацняцца вецер — парывамi да 15—20 м/с, а ў дзённыя гадзiны па поўднi месцамi — да 21—23 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мiнус 2 градусаў да 4 цяпла.

На жаль, i ў сераду захаваюцца складаныя ўмовы надвор'я. На большай частцы краiны чакаецца снег, мокры снег, уначы месцамi — моцны снег, завiруха. На асобных участках дарог магчымая галалёдзiца. Уначы i ранiцай у многiх раёнах краiны будзе ўзмацняцца вецер парывамi да 15—20 м/с, у асобных раёнах — да 23 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мiнус 5 градусаў, удзень будзе ад мiнус 3 да 2 градусаў вышэй за нуль.

У чацвер, што нядзiўна, зноў «запахне» зiмой. Уначы месцамi, а ўдзень на большай частцы краiны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзiца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 марозу, пры праяснennях — да мiнус 9 градусаў. Удзень будзе ад мiнус 4 градусаў да 1 цяпла.

Паводле папярэднiх прагнозаў айчынных сiноптыкаў, у пятнiцу перыядычна будзе iсцi снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзiца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, пры праясненнях — да мiнус 10 градусаў. Удзень будзе ад мiнус 5 градусаў да 1 цяпла. Незразумела, цi то зiма, цi то еўразiма?

**Сяргей КУРКАЧ.**

Запрашальнiк

# «Выконваем законы дарог!»

**Драўляны святлафор, iнспектар ДПС з цеста, ёлачныя аздабленнi ў выглядзе дарожных знакаў — гэта i многае iншае можна ўбачыць на выстаўцы дзiцячай творчасцi, якая праходзiць цяпер у Мiнскiм палацы дзяцей i моладзi. Наведаць яе можна будзе да 29 студзеня.**

Звыш трохсот работ, выкананых рукамi сталiчных школьнiкаў 6 — 17 гадоў, прадстаўлена на суд гледача ў наступных намiнацыях: «Малюнак», «Плакат», «Лепка», «Мяккая цацка», «Дэкаратыўнае пано», «Сачыненне», «Калекцыя мадэляў», «Камп'ютарны рэкламны ролiк» i «Тэлесюжэт».

— Кампетэнтным журы ў кожнай намiнацыi будуць вызначаны найлепшыя работы, аўтары якiх атрымаюць памятныя прызы ад арганiзатараў мерапрыемства. Юныя наведвальнiкi могуць таксама прагаласаваць за ўпадабаную работу i тым самым зрабiць яе пераможцам у конкурсе сiмпатый гледачоў. Як паказвае практыка, вызначыць найлепшую работу, зробленую сваiмi рукамi, вельмi складана. Бо творы з дрэва, пластылiну, пацерак, пенапласту здзiўляюць сваiм майстэрствам i фантазiяй, — распавяла **старшы iнспектар па агiтацыi i прапагандзе АДАI Партызанскага РУУС г. Мiнска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Акрамя таго, госцi выстаўкi могуць пагутарыць з iнспектарам ДАI, якi раскажа пра дарожную абстаноўку ў горадзе, нагадае юным удзельнiкам асноўныя аспекты бяспекi, а таксама адкажа на ўсе пытаннi, якiя iх цiкавяць.

У пачатку лютага адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў, i найлепшыя работы адправяцца прадстаўляць сталiцу на рэспублiканскiм этапе конкурсу «Выконваем законы дарог!» Экспазiцыя творчых работ ужо стала традыцыйнай i праводзiцца штогод.

Асалода чытання

# АСОБА ПАЧЫНАЕЦЦА З ДЗIЦЯЧАЙ КНIГI

**Днямi прадстаўнiкi Мiнiстэрства iнфармацыi, Мiнiстэрства адукацыi, Нацыянальнай акадэмii навук, Саюза пiсьменнiкаў Беларусi сабралiся разам, каб абмеркаваць актуальную тэму папулярызацыi чытання сярод дзяцей i падлеткаў.**

Дзiцячая лiтаратура павiнна прывiваць жаданне да развiцця творчай фантазii. Такое меркаванне выказаў **начальнiк упраўлення выдавецкай i палiграфiчнай дзейнасцi Мiнiстэрства iнфармацыi Уладзiмiр АНДРЫЕВIЧ:**

— Цiкавасць сучасных бацькоў да такiх кнiг адназначна ёсць, аднак яны адзначаюць, што апошнiм часам у дзiцячай беларускай лiтаратуры ўсё больш назiраецца выкарыстанне нелiтаратурных слоў, так званых дыялектызмаў, што можа стаць праблемай. Упэўнены, што пiсьменнiкам трэба прытрымлiвацца класiчнай лiтаратурнай мовы, каб прыцягнуць дзяцей i падлеткаў да чытання па-беларуску. У нас сёння не хапае фантастыкi i прыгоднiцкай лiтаратуры, якiя карыстаюцца вялiкiм попытам у падлеткаў. Калi казаць пра выхаванне будучага грамадзянiна нашай краiны, трэба звяртаць асаблiвую ўвагу на навукова-папулярную лiтаратуру i тую, што расказвае пра гiсторыю, традыцыi Беларусi, сямейныя каштоўнасцi. Ад таго, што чытаюць дзецi i як, залежыць вельмi многае ў iх далейшым жыццi. Таксама бацькам вельмi важна чытаць разам з дзецьмi, каб тлумачыць тое, чаго яны яшчэ не ведаюць, дапамагаць аналiзаваць з мэтай фармiравання ўласнага меркавання.

Чытанне добрай лiтаратуры фармiруе дзiця як асобу, а адносiны да гэтага занятку закладваюцца яшчэ ў сям'i. I таму для таго каб нешта прапанаваць сваiм малым, бацькi павiнны быць добра адукаваныя ў галiне сучаснай дзiцячай лiтаратуры. Так лiчыць **начальнiк упраўлення манiторынгу якасцi адукацыi навукова-метадычнай установы «Нацыянальны iнстытут адукацыi» Мiнiстэрства адукацыi Вячаслаў КАРАТКЕВIЧ:**

— У асноўным бацькi цяпер выбiраюць для сваiх дзяцей тую лiтаратуру, якую яны чыталi ў сваiм дзяцiнстве, аднак трэба пашыраць веды, знаёмiца з цяперашнiмi аўтарамi. Сёння ва ўсiм свеце вялiкая ўвага аддаецца развiццю чытацкай пiсьменнасцi. Як паказваюць шматлiкiя мiжнародныя даследаваннi, штогадовае манiторынгавае даследаванне Нацыянальнага iнстытута адукацыi, тыя падлеткi, якiя шмат чытаюць, маюць вялiкую бiблiятэку дома, паказваюць значна лепшыя вынiкi па розных прадметах у школе, лепш адаптуюцца ў розных сацыяльных умовах, хутчэй дасягаюць поспеху ў прафесiйнай дзейнасцi. Час вучобы ў школе — адзiн з найважнейшых перыядаў у жыццi дзяцей, менавiта ў гэты момант настаўнiкам важна навучыць тых аналiзаваць прачытанае, навучыць асэнсаванаму чытанню. З мэтай павышэння цiкавасцi дзяцей да кнiг, крытычнага мыслення штогод распрацоўваюцца новыя навучальныя дапаможнiкi, якiя ўжо сёння дастаткова высока ацэньваюць настаўнiкi i вучнi. Апошнiя маюць шэраг незвычайных заданняў, што абуджаюць iнтарэс да тэкстаў, вучаць iнакш глядзець на класiчныя лiтаратурныя ўзоры.

Такiм чынам, спiкеры абазначылi тэндэнцыi i перспектывы развiцця дзiцячай лiтаратуры. Вiдавочна, што мода на чытанне сярод дзяцей i падлеткаў ёсць. Кнiга, як i раней, застаецца iх найлепшым сябрам. I гэта, безумоўна, стварае добрыя магчымасцi для вядучых выдавецтваў краiны i ўсiх тых, хто прапаноўвае чытачам цiкавыя кнiжныя навiнкi.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Здарэнне

# Галава захрасла ў агароджы

**У 2.32 у Светлагорскi раённы аддзел па надзвычайных сiтуацыях ад дзяжурнага РАУС паступiла паведамленне аб тым, што галава мужчыны захрасла памiж прутамi металiчнай агароджы па вулiцы Шасэйнай.**

Як паведамляе МНС, калi да месца выклiку прыбылi ратавальнiкi, было ўстаноўлена, што малады чалавек 1992 года нараджэння пры спробе пералезцi праз агароджу спатыкнуўся i яго галава захрасла памiж прутамi, самастойна выбрацца ён не мог.

Работнiкi МНС пры дапамозе адмысловага гiдраўлiчнага iнструмента расцiснулi агароджу, мужчыну дэблакiравалi. Стан яго здавальняючы, у медыцынскай дапамозе патрэбы не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ І МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ

## Удзельнікі VI Усебеларускага народнага сходу азнаёміліся з праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і Гродзенскага рэгіёна

**На сходзе Гродзеншчыну прадставяць 310 дэлегатаў. Гэта актыў рэгіёна, сярод якога нямала кіраўнікоў, дэпутатаў Саветаў розных узроўняў, прадпрымальнікаў, прадстаўнікоў навукі, культуры, спорту. Было адзначана, што такая сустрэча вельмі важная, бо праходзіць напярэдадні Усебеларускага сходу і вызначае новы этап развіцця краіны, у тым ліку Гродзенскага рэгіёна.**




Асноўныя кірункі праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця прадставіў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** Ён удакладніў, што гэта яшчэ не канчатковы дакумент. Праграма будзе дапаўняцца з улікам прапаноў дыялогавых пляцовак і работы Усебеларускага сходу. Між тым работа над дакументам вялася два гады і аб'ядната вялікае кола ўдзельнікаў эканамічнай супольнасці. Ад чаго быў зроблены старт? Па словах міністра эканомікі, у аснову пакладзены дасягненні мінулых пяцігодак і зроблены прагноз на будучае з улікам патрэб насельніцтва і тых выклікаў, якія могуць перашкаджаць рухацца наперад. Увогуле, галоўныя прыярытэты — гэта дабрабыт людзей, занятасць, цэны, даступнасць жылля, аховы здароўя, адукацыі. А дасягнуць гэтага магчыма толькі з высокім узроўнем развіцця індустрыяльнага патэнцыялу прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Вядома, з улікам сучасных лічбавых тэхналогій.

У праекце зроблены акцэнт на моцныя рэгіёны. І тут, па словах Аляксандра Чарвякова, важна вызначыць пункты росту. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці адным з такіх пунктаў павінна стаць развіццё хімічнай прамысловасці і аграпрамысловага комплексу. У вобласці выpабляецца 17 % харчовай прадукцыі краіны, але патэнцыял яшчэ ёсць. Напрыклад, праз паляпшэнне бальнасці зямлі.

Важным кірункам павінна стаць перапрацоўка мясцовай сыравіны. Тут ёсць добрыя зрухі ў дрэваапрацоўчай галіне. І цяпер тэмпы вытворчасці пастаянна растуць. За дзесяць гадоў галіна амаль у тры разы павялічыла аб'ёмы. Новы сучасны дрэваапрацоўчы завод пачаў будавацца ў Свіслацкім раёне. Але варта займацца глыбінёй перапрацоўкі. Пакуль прадпрыемствы больш экспартуюць драўнянастружкавыя пліты, чым гатовыя вырабы. Таму наступны крок — гэта стварэнне мэблевага кластара.

Таксама рэгіёну варта звярнуць больш увагі на развіццё турыстычных паслуг. Тут трэба шукаць новыя формы аказання паслуг, больш актыўна займацца ўнутраным турызмам, развіваць гасцінічны бізнес, гандаль і сферу грамадскага харчавання.

Такім чынам, у цэлым па краіне ў малых і сярэдніх гарадах, сельскіх раёнах стаўка будзе зроблена на паглыбленую перапрацоўку мясцовых рэсурсаў і сельгаспрадукцыі, стварэнне на гэтай аснове новых прадпрыемстваў. Такая работа ўжо вядзецца, але пакуль няма значных праектаў, іх літаральна у найбліжэйшы час трэба вызначыць.

Чаго чакаць ад рэалізацыі рэгіянальнай палітыкі? Па словах міністра эканомікі, заработная плата ў рэгіёнах да канца пяцігодкі павінна павялічыцца не менш чым у 1,5 раза, інвестыцыі у 1,2 раза. Ёсць верагоднасць з боку дзяржавы накіраваць дадатковыя сілы для стварэння новых прадпрыемстваў, як гэта зроблена ў Аршанскім раёне. Урад рыхтуе цэлы комплекс прапаноў, каб даць больш стымулаў там, дзе ніжэйшы патэнцыял, каб тым самым зацікавіць інвестара.

Запуск новага інвестыцыйнага цыкла ляжа ў аснову работы эканомікі Гродзеншчыны, адзначыў **старшыня аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** Падмурак для такой работы ужо ёсць. У вобласці на 2021—2025-я гады запланавана будаўніцтва новага завода на «Гродна Азот», стварэнне шкляной тары з выкарыстаннем інавацыйных тэхналогій, дрэваапрацоўчае прадпрыемства ў Смаргонскім раёне, працяг будаўніцтва АЭС і іншыя. У кожным раёне вобласці прадугледжана адзін-два праекты па будаўніцтве прадпрыемстваў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.



Дэлегаты VI Усебеларускага народнага сходу — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Нацыянальга сходу па адукацыі, культуры і навуцы Лілія КІР'ЯК, старшыня Слонімскага райвыканкама Генадзь ХОМІЧ, магістрант ГрДУ імя Янкі Купалы Бажэна ЯРЭМІЧ.

Уладзімір Каранік падкрэсліў, што тая праграма, якая зараз абмяркоўваецца, даволі амбіцыйная. У вобласці, як і ва ўсёй краіне, больш чым у 1,5 раза плануецца павялічыць заработную плату. На столькі ж рэгіён мяркуе павялічыць даходы бюджэту. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць павялічыць фінансаванне бюджэтнай сферы.

— У фарміраванні прагнозу мы кіраваліся напрацоўкай рэспубліканскіх органаў і прапановамі з месцаў. Нам ёсць чым ганарыцца, нават у складаны 2020 год вобласць не дапусціла спаду эканомікі. Гэта зроблена, дзякуючы росту сельскай гаспадаркі, прамысловасці, сферы паслуг. Тое, што гарантуе сістэматычнае паступленне ў бюджэт, каб мы маглі больш поўна выконваць нашы сацыяльныя абавязацельствы. У цэнтры любой праграмы знаходзяцца чалавек і яго інтарэсы. І бюджэт вобласці і краіны дэманструе сацыяльную скіраванасць.

Удзельнікі сходу маглі задаць пытанні спікерам. У прыватнасці, прагучала пытанне аб развіцці аховы здароўя. Уладзімір Каранік паведаміў, што стаўка будзе зроблена на міжрэгіянальныя медыцынскія цэнтры. Такая клініка працуе ў Астраўцы, на чарзе — Ліда і Ваўкавыск. Завяршаецца рэканструкцыя 4-й бальніцы Гродна, будуецца анкадыспансер. Рыхтуецца праект рэканструкцыі інфекцыйнай бальніцы. Будзе два інфекцыйныя стацыянары. Вобласць актыўна аснашчаецца апаратамі МРТ. У інвестпраграму закладзена будаўніцтва новай бальніцы замест 2-й гарадской, якая месціцца у прыстасаваным памяшканні.

Таксама ўдзельнікі сходу атрымалі адказы на пытанні па зарплатах бюджэтнікаў, фінансаванні навукі, прафесійнай арыентацыі школьнікаў.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** зазначыў, што ніводнае пытанне, якое паўстала на сходзе і падчас работы дыялогавых пляцовак, не застанецца па-за ўвагай. А іх паступіла нямала, што сведчыць аб высокай актыўнасці і грамадзянскай пазіцыі беларусаў, якія неабыякавыя да развіцця сваёй краіны, свайго рэгіёна, свайго прадпрыемства. Максім Рыжанкоў таксама паведаміў, што падчас работы Усебеларускага сходу будзе створана камісія, якая зоймецца збіраннем і абагульненнем усіх прапаноў менавіта падчас форуму. Усе будуць пачутыя, усе вартыя ідэі і прапановы будуць улічаны, запэўніў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

## Слова — удзельнікам

# «Хацелася б, каб лёгкая атлетыка атрымала дадатковы стымул для развіцця»



**Аляксандры УРБАНОВІЧ — 24 гады, з якіх 15 яна займаецца спортам. Цяпер дзяўчына — інструктар-метадыст спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву № 2 горада Ліды. Трэці год працуе трэнерам-выкладчыкам па лёгкай атлетыцы. Ад спартыўнай галіны абрана дэлегатам на VI Усебеларускі сход. Гэту падзею адзначае як вельмі важную ў сваім жыцці, бо ўпершыню бярэ ўдзел у такім значным для дзяржавы мерапрыемстве.**

Пачынала сваю спартыўную кар'еру Аляксандра з футбола. Бацька прывёў яе ў спартыўны клуб у шэсць гадоў. Так і займалася дзяўчынка футболам, пакуль яе не заўважыў трэнер дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы падчас школьных спаборніцтваў. Ён і перацягнуў школьніцу ў лёгкую атлетыку. З таго часу менавіта гэты спартыўны кірунак стаў галоўным у кар'еры Аляксандры. У 9-м класе яна паступіла ў Віцебскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву, зараз працягвае вучобу ў ВНУ і вядзе спартыўную падрыхтоўку будучых чэмпіёнаў.

У самога трэнера нямала спартыўных дасягненняў. Яна — кандыдат у майстры спорту, удзельніца чэмпіяната Еўропы сярод юніёраў, неаднаразовая пераможніца і прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў. Сёлета стала пераможніцай міжгаліновай алімпіяды работнікаў фізічнай культуры, спорту і турызму, выступае за Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт.

Значныя намаганні Аляксандра прыкладае ў рабоце з дзецьмі. Па словах маладога трэнера, вельмі важна падабраць матываваных дзяцей, якія жадаюць будаваць сваю спартыўную кар'еру. І тут многае залежыць ад трэнера. Бо гэта яго задача — убачыць у дзіцяці задаткі спартсмена і развіваць іх.

— Галоўнае — зацікавіць дзяцей, каб яны былі скіраваны на вынік, зрабіць правільную расстаноўку. Кагосьці паставіць на доўгія дыстанцыі, кагосьці — на кароткія, іншага — на скачкі. Вядома, ёсць і методыка адбору, для трэнера існуе нямала дапаможнікаў, але нельга не ўлічваць асабістыя якасці трэнера, інтуіцыю, у спорце гэта таксама важна, — лічыць суразмоўніца. — Ну і з бацькамі наладжваць кантакт. Бо цяпер як бацькі скажуць, так дзіця і робіць. А многія хочуць бачыць сыноў і дачок знакамітымі спартсменамі.

Вядома, як дзіцячага трэнера яе цікавіць і хвалюе развіццё дзіцяча-юнацкага спорту. У яе група школьнікаў з 4-га да 6-га класа. Заняткі праходзяць тры разы на тыдзень па паўтары гадзіны на базе сярэдняй школы.

— Хацелася б, каб лёгкая атлетыка атрымала падтрымку. Лічу, што пакуль у нас недастаткова спартыўных лёгкаатлетычных збудаванняў. Займацца з вялікай колькасцю дзяцей у спартыўных залах не вельмі зручна. Хацелася б, каб былі такія збудаванні спецыяльна для лёгкай атлетыкі. Асабліва ў невялікіх гарадах.

Што датычыцца трэнерскага саставу, дэфіцыту кадраў няма. Тут працуе нямала знакамітых спартыўных педагогаў. Адметна, што працаваць вяртаюцца былыя выхаванцы дзіцяча-юнацкай школы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю і спрабуюць сябе на трэнерскай рабоце. Такая магчымасць ім даецца. Усе яны любяць сваю работу і працуюць самааддана. Гэтаму спрыяе і той факт, што трэнеры мясцовыя, таму клапоцяцца аб гонары свайго роднага краю, імкнуцца праславіць яго спартыўнымі дасягненнямі. На думку Аляксандры Урбановіч, на Усебеларускім сходзе варта закрануць і гэтае пытанне, каб выхаванцы спартыўных школ вярталіся працаваць менавіта ў свае родныя ўстановы.

— Спорт у краіне развіваецца вельмі актыўна, яго пастаянна папулярызуюць — як масавы спорт, так і прафесійны. Будуецца вельмі шмат спартыўных аб'ектаў. Напрыклад, у Лідзе пабудаваны адкрыты футбольны манеж, ёсць Лядовы палац, нядаўна адкрыўся для наведвання вялікі спартыўны комплекс «Алімпія», працуе басейн, трэнажорныя залы. Створаны ўсе ўмовы для заняткаў спортам, і гэта вельмі запатрабавана.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# З УЛІКАМ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

***— Кажуць, што без аналізу мінулага нельга прагназаваць будучыню. Апошні год быў асабліва цяжкі і нестабільны, як у сусветным маштабе, так і ў межах нашай краіны. Тым не менш Магілёўская вобласць вельмі дастойна справілася з унутранымі і знешнімі выклікамі. І пры гэтым адзіная ў краіне прадэманстравала рост ВРП і выканала асноўныя прагнозныя паказчыкі. А наколькі ўражваюць вынікі пяцігодкі ў цэлым?***

— За 2016—2020 гады Магілёўская вобласць забяспечыла выкананне пяцігадовай праграмы па экспарце тавараў і паслуг. Рост экспарту тавараў без уліку рэспубліканскіх арганізацый нават нягледзячы на аб'ектыўнае зніжэнне яго ў 2020 годзе, у цэлым за пяцігоддзе склаў 152 % пры заданні 128,1 %. А экспарт паслуг вырас да 145 % пры заданні 119,1 %.

За пяць гадоў у эканоміку рэгіёна паступіла каля 390 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове пры заданні 362,2 мільёна. Акрамя гэтага, выканана заданне па рабочых месцах, на якія за пяць гадоў працаўладкавана больш чым 23 тысячы чалавек пры запланаваных 22 тысячах, рост заработнай платы пры гэтым склаў 174,7 % да 2015-га года пры заданні 165,6—171,2 %.

Прамысловы комплекс фарміруе каля 40 % ВРП нашага рэгіёна і ў той жа час з'яўляецца найбольш уразлівым звяном перад знешнімі эканамічнымі пагрозамі і выклікамі. Гэта яскрава прадэманстраваў мінулы год, на працягу якога прадпрыемствы сутыкаліся з цяжкасцямі пры куплі камплектуючых і збыце прадукцыі. Пры ўсім гэтым яны здолелі захаваць працоўныя калектывы, дагаворныя абавязацельствы з партнёрамі і на выхадзе паказалі тэмп росту 103,4 % па годзе. У цэлым жа за пяцігодку індэкс вытворчасці прамысловай прадукцыі склаў 114,9 %.

Дынамічнае развіццё прамысловага комплексу дазволіла істотна нарасціць аб'ёмы вытворчасці асобных відаў прадукцыі. Вось толькі некаторыя прыклады — з 2016 года ў 1,6 раза павялічана вытворчасць натуральнамалочнай прадукцыі і хімічных валокнаў, у 1,4 раза — паперы і кардону, на 30 % прыраслі аб'ёмы вытворчасці сыроў, на 11 % — цэменту. На жаль, не ўсё тое, што планавалася, дасягнута. Ёсць над чым папрацаваць у наступнай пяцігодцы.



golk.by

**Адно з паспяхова працуючых прадпрыемстваў паўднёва-ўсходняга рэгіёна ў Касцюковічах — Беларускі цэментны завод.**

***— У будучай пяцігодцы акцэнт па-ранейшаму робіцца на новыя рынкі, інвестыцыі, інавацыі, стварэнне кластараў як найбольш эфектыўнай формы вядзення бізнесу...***

— У нас ёсць трывалы падмурак для таго, каб паспяхова развівацца па ўсіх гэтых кірунках. Праведзена вялікая работа па тэхнічным пераўзбраенні дзеючых прамысловых вытворчасцяў і стварэнні новых. За пяць гадоў на прамысловых прадпрыемствах вобласці рэалізаваны шэраг ключавых інвестыцыйных праектаў. Сярод іх — стварэнне комплексу па вытворчасці поліэфірнай прадукцыі на ААТ «Магілёўхімвалакно», рэалізацыя праекта па вытворчасці паперы-асновы на Шклоўскім заводзе газетнай паперы, а таксама інавацыйнага праекта на «Магатэксе». Праведзена мадэрнізацыя вытворчасцяў на «Белшыне», «Магілёўліфтмашы», «Ольсе», «Спартаку», Бабруйскім заводзе раслінных алеяў, гарбарным камбінаце ў філіяле «Ялізава» Гродзенскага шклозавода і іншыя. Актыўна развіваюцца дрэваапрацоўчы і хімічны кластары, створаныя прыватнымі кампаніямі ў свабоднай эканамічнай зоне «Магілёў».

Толькі па сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктах харчавання мы пастаўляем 114 таварных пазіцый у 43 краіны свету (у 2015 годзе — 34 краіны). Напрыклад, калі ў 2015 годзе экспарт малочнай прадукцыі ажыццяўляўся толькі ў дзевяць краін свету, то ў 2019 годзе — ужо ў 22 краіны.

Знойдзены новыя стратэгічныя знешнія партнёры. Тут асаблівае месца займае Кітай. У 2015 годзе мы экспартавалі ў рэгіёны Кітая тавараў на суму крыху больш чым два мільёны долараў, а ў 2020 годзе гэты аб'ём вырас у 15 разоў і дасягнуў 30 мільёнаў долараў.

Гэтаму садзейнічала актыўная пазіцыя вобласці па развіцці міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Магілёўшчына мае дзелавыя сувязі больш чым з сотняй краін свету і толькі за апошні год мы знайшлі каля дзесяці новых рэгіёнаў для збыту нашай прадукцыі. Актыўна вядзецца работа па ўмацаванні трывалых эканамічных сувязяў з Прыморскім краем Расійскай Федэрацыі.

З найлепшага боку паказала сябе прадпрымальніцкае асяроддзе. У вобласці зарэгістравана каля 8,5 тысячы юрыдычных асоб і амаль 26 тысяч прадпрымальнікаў. І нават нягледзячы на складаны мінулы год, колькасць ІП у Магілёўскай вобласці павялічылася. На гэтым фоне мы бачым паступальны рост удзельнай вагі падаткаў у бюджэт вобласці: у 2015 годзе ён быў на ўзроўні 28 %, а ў 2020 годзе дасягнуў 39 %.



mogilev-region.gov.by

**Хоцімск становіцца ўсё больш прывабным для пражывання**

З мэтай нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на Магілёўшчыне ўкараняюцца новыя інтэнсіўныя тэхналогіі і апошнія дасягненні навукі. За 2016—2020 гады на тэрыторыі вобласці ўведзены ў эксплуатацыю 42 малочнатаварныя фермы. Для нарошчвання вытворчасці свініны пабудаваны два новыя свінагадоўчыя комплексы ў Бялыніцкім і Слаўгарадскім раёнах.

***— Рэгіянальная палітыка на будучую пяцігодку накіравана на павышэнне прывабнасці для жыцця і работы невялікіх гарадоў, размешчаных за межамі сталіцы і абласных цэнтраў. Гэта перш за ўсё стварэнне новых высокатэхналагічных рабочых месцаў, будаўніцтва жылля і сацыяльных аб'ектаў...***

— Такая работа вядзецца намі ўжо не першы год. У рамках рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці» і Праграмы з аднайменнай назвай дасягнуты пэўныя станоўчыя вынікі — створана 230 новых камерцыйных арганізацый, суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў у гэтых раёнах перавысіла дзве тысячы чалавек, на зноў створаныя рабочыя месцы працаўладкавана каля 2,5 тысячы чалавек. У эканоміку і сацыяльную сферу рэгіёна накіравана больш чым адзін мільярд рублёў інвестыцый у асноўны капітал, прыцягнута каля 37 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый. Па выніках работы за пяць гадоў тэмп росту выручкі на аднаго сярэдняспісачнага работніка павялічаны тут больш чым у два разы. Пры гэтым суадносіны сярэднеабласной выручкі на аднаго работніка і аналагічнага паказчыка па паўднёва-ўсходнім рэгіёне павялічылася з 69,8 % у 2016 годзе да 86,1 % у 2020-м.

За пяць гадоў на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна ўведзена ў эксплуатацыю амаль 170 тысяч квадратных метраў жылля, пабудавана і адрамантавана 190 кіламетраў мясцовых аўтамабільных дарог. Паўднёва-ўсходні рэгіён — гэта трэць раёнаў нашай вобласці, якія ў сілу розных абставін трапілі ў складанае эканамічнае становішча. Але дзякуючы дзяржпадтрымцы яны атрымалі магчымасць яго палепшыць. І новая праграма на будучую пяцігодку з пашыраным пералікам ільгот і прэферэнцый, якая была зацверджана сёлета, дасць магчымасць стварыць для тых, хто тут жыве, найбольш камфортныя ўмовы.

***— Прэзідэнт неаднаразова звяртаў увагу на тое, што сацыяльна-эканамічная палітыка дзяржавы не павінна ісці ў разрэз з жаданнямі і спадзяваннямі народа. Часта даводзілася бачыць, якія гарачыя абмеркаванні разгараліся часам на дыскусійных пляцоўках, як актыўна людзі спрабавалі данесці тое, што можа дапамагчы арганізаваць якасную работу на месцах і ў выніку прывесці да росту дабрабыту краіны.***

— Жыхары Магілёўшчыны з кастрычніка мінулага года актыўна ўдзельнічаюць у гэтым працэсе. Усяго ў вобласці праведзена больш чым 120 дыялогавых пляцовак, паступіла і накіравана ў аргкамітэт сходу звыш 270 прапаноў ад насельніцтва і грамадскіх аб'яднанняў. Шырокі рэзананс у вобласці мела дыскусійная пляцоўка «Эканоміка», дзе абмяркоўвалася галоўнае пытанне: чаго не хапае эканоміцы краіны для ўстойлівага і апераджальнага росту? У абмеркаванні бралі ўдзел кіраўнікі найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў, прыватных кампаній, прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу, вышэйшых навучальных устаноў і тэхнапаркаў, асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Магілёўскай вобласці. Усе салідарныя ў тым, што важным крокам у найбліжэйшай перспектыве павінна стаць удасканаленне спрыяльнага дзелавога асяроддзя — стварэнне стабільных, камфортных і прадказальных умоў для інвеставання і вядзення бізнесу. Першымі ў гэтым ланцужку знаходзяцца ВНУ, паколькі менавіта там зараджаюцца новыя ідэі і распрацоўкі, а таксама рыхтуюцца кадры для рэальнага сектара эканомікі. Паступіў шэраг прапаноў па больш якасным адборы аспірантаў ВНУ, па ўзаемадзеянні вышэйшых навучальных устаноў з прадпрыемствамі і арганізацыямі. Усе выказваліся за тое, што надышоў час укараняць новыя інструменты падтрымкі прадпрымальніцтва як на пачатковым этапе стварэння суб'екта гаспадарання, так і на этапах яго развіцця. Мы бачым, што многія інструменты, якія прадугледжаны дзеючым Указам № 255 і актуальныя ў 2009 годзе, цяпер незапатрабаваныя, ёсць вострая неабходнасць у новых формах падтрымкі. Для таго каб утрымаць моладзь у рэгіёне, неабходна даць ёй магчымасць самарэалізавацца. Патэнцыял ёсць. За апошнія пяць гадоў у разы вырасла колькасць жадаючых узяць удзел у стартап-конкурсах. На жаль, мы не маем заканадаўчай магчымасці даць грант на рэалізацыю найлепшых праектаў і падтрымаць бізнес, які толькі пачынаецца. У выніку маладыя людзі часта знаходзяць фінансаванне па-за межамі нашай краіны. Гэтыя і іншыя прапановы былі накіраваны для разгляду на вышэйшым узроўні. І многія з іх знайшлі сваё адлюстраванне ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




mogilev.belstat.gov.by

**Дынаміка валавога рэгіянальнага прадукту (ВРП) Магілёўшчыны ў 2019 — 2020 гадах (у супастаўных цэнах і працэнтах).**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых,1 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 (имущество реализуется одним лотом)**
Адрес — **Гомельская обл., г. Лоев, ул. Царикова, д. 39**

**Производственная база** в составе: **бытовые помещения** (340/С-293597, 58,5 кв. м), **здание конторы** (340/С-293567, 52,2 кв. м), **склад** (340/С-293569, 115,9 кв. м), **здание производственного корпуса** (340/С-293570, 267,5 кв. м, составные части: два забора, трое ворот, асфальтное покрытие), **котельная** 340/С-293568, 100,2 кв. м, составные части: труба дымовая (h = 24 м), емкости для топлива – 2 шт. по 6 куб. м), **гараж** (340/С-293565, 82,3 кв. м).
***Сведения о земельном участке***: предоставлен продавцу, пл. **0,3603 га,** на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений молочного завода**.** Ограничения (обременения) – находится в водоохранных зонах

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 91 087,24 бел. руб.**
(снижена на 40 %)

**Лот № 2**
Адрес **– Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Карла Маркса, 25-16**

**Квартира** (расположена в пятиэтажном жилом доме 2010 г. п. на 4-м этаже и состоит из двух жилых комнат, 340/D-219285; 66,5 кв. м)

**Начальная стоимость лота № 2 без НДС – 51 720,00 бел. руб.**
(снижена на 40 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.12.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов — 12.02.2021 в 14.00.**<br>**Окончание торгов — 12.02.2021 в 15.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.02.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**<br>**E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | СУП «Гомельская СПМК-119» ОАО «Гомельоблстрой» г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а |

**Предмет аукциона**
Транспортные средства, бывшие в употреблении, расположенные по адресу: г. Гомель, Кореневское шоссе, 4а

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой бортовой МАЗ 5336 А3 320, 2008 г. в., рег. знак АВ 8373-3 | 2795,01 | 139,75 |
| 2 | Экскаватор EW-1400, 2008 г. в., рег. знак ЕВ-3 1224 | 12 040,06 | 602,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Контактные лица по осмотру: тел. +37529-670-83-18 (Громыко Юлия Ивановна), +37544-564-52-67 (Леонид Павлович Абакумов)

Лица, желающие принять участие в торгах, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».**
Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 09.02.2021 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного закона.
Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.
В случае регистрации или явки на аукцион одного участника (претендент на покупку) предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by**

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда», в ЕГРСоБ 05.11.2020

**Дата, время, место проведения аукциона: 11.02.2021** в 12.00, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок **с 9.00 27.01.2021 до 17.00 09.02.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06.**<br>**E-mail: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении 17 февраля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| **Предмет торгов** |
|---|
| Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1 |
| **Начальная цена: 1 885 851,00 бел. руб. без учета НДС** |
| **Сумма задатка: 188 000,00 бел. руб.** |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.
**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Торги проводятся **17 февраля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **27.01.2021 по 15.02.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 25.02.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Машино-место № 125.1 с инвентарным номером 500/D-708120442 общей площадью 13,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-327. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 11 491,20 бел. рубля, размер задатка – 1 149,12 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 2.** Машино-место № 125.2 с инвентарным номером 500/D-708120443 общей площадью 26,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-328. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 13 219,20 бел. рубля, размер задатка – 1 321,92 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 3.** Машино-место № 127 с инвентарным номером 500/D-708120444 общей площадью 20,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-330. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 12 528,00 бел. рубля, размер задатка – 1 252,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 4.** Машино-место № 127.1 с инвентарным номером 500/D-708120445 общей площадью 30,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-331. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 13 651,20 бел. рубля, размер задатка – 1 365,12 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 5**. Машино-место № 128.2 с инвентарным номером 500/D-708120448 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-334. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 11 404,80 бел. рубля, размер задатка – 1 140,48 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-699925 общей площадью 455,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, 78, пом. 1Н. Назначение: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения; наименование: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. **Начальная цена продажи – 552 096,00 бел. рубля, задаток – 55 209,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 615/С-4207 общей площадью 620,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Червенский р-н, Червенский с/с, д. Островы, ул. Центральная. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: контора. Составные части и принадлежности: подвал. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625880400001000557 площадью 0,0987 га. **Начальная цена продажи – 70 934,40 бел. рубля, размер задатка – 7 093,44 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-20796 общей площадью 575,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пер. Первомайский 1-й, 2Ж. Назначение: здание нежилое; наименование: административное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321850100001001083 площадью 0,7817 га. **Начальная цена продажи – 67 996,80 бел. рубля, размер задатка – 6 799,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 9.** Единый объект недвижимого имущества: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-53082 общей площадью 551,1 кв. м, назначение: здание блока гаражей, наименование: одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000159 площадью 10,8010 га (право постоянного пользования 26/27), по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/2. **Начальная цена продажи – 84 499,20 бел. рубля, размер задатка – 8 449,92 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-656043 общей площадью 108,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 185-20. Назначение: квартира, наименование: квартира № 20. *Имеется самовольная перепланировка, не зарегистрированная в установленном порядке.* **Начальная цена продажи – 269 280,00 бел. рубля, размер задатка – 26 928,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 602/С-30634 общей площадью 1643,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ф. Энгельса, д. 4. Назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование: произведственная база. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624450100001002436 общей площадью 5,6914 га. **Начальная цена продажи – 293 544,00 бел. рубля, размер задатка – 29 354,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-158930 общей площадью 63,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 13А/2. Назначение: здание неустановленного назначения. Наименование: здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: две пристройки. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000002000347, площадью 2,2878 га. **Начальная цена продажи – 20 700,00 бел. рубля, задаток – 2 070,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 13.** Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-49380 общей площадью 33,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Пинск, ул. Красноармейская, 53А-5. Назначение: помещение транспортного назначения. Наименование: гараж. **Начальная цена продажи – 4 410,00 бел. рубля, задаток – 441,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 14.** Незавершенное незаконсервированное, незарегистрированное капитальное строение гаража с инвентарным номером 720/U-, общей площадью 45,1 кв. м, площадь застройки 51,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Горецкий район, ул. Строителей, 23/136, ПГСК «ГоркиАвтоПлюс». **Начальная цена продажи – 6570,00 бел. рубля, задаток – 657,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798182003 общей площадью 341,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 25-10. Назначение: помещение неустановленного назначения. Наименование: кабинеты. Гардероб. Медицинские кабинеты. **Начальная цена продажи – 491 400,00 бел. рубля, размер задатка – 49 140,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 16.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798182004 общей площадью 336,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 25-11. Назначение: административное помещение. Наименование: Административное помещение. **Начальная цена продажи – 625 320,00 бел. рубля, размер задатка – 62 532,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 17.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798182002 общей площадью 3 956,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 25-9. Назначение: производственное помещение. Наименование: производственное помещение. **Начальная цена продажи – 2 512 080,00 бел. рубля, размер задатка – 251 208,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 18.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798182005 общей площадью 4 293,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 25-12. Назначение: производственное помещение. Наименование: производственное помещение. **Начальная цена продажи – 2 674 080,00 бел. рубля, задаток – 267 408,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Условия**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость»

**Аукцион состоится 25.02.2021 в 15.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений – 22.02.2021 в 15.00.**
Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **25 февраля 2021 года.**
Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63**

# КАБ НЕ «ПЛАДЗІЦЬ» ДАЎГАБУДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Здалі ў эксплуатацыю шэсць дзіцячых садкоў (у раёне вуліц Міхалова і Алібегава; праспектаў Дзяржынскага і Любімава; у мікрараёнах Лошыца-9 і Лебядзіны, а таксама два садкі ў жылым комплексе «Маяк Мінска»).

Летась выканана рэканструкцыя 20-й гарадской паліклінікі, галоўнага корпуса кардыяхірургічнага аперблока і блока трансплантацыі ствалавых клетак 9-й гарадской клінічнай бальніцы, неўралагічнага корпуса 5-й гарадской клінічнай бальніцы. Завершана будаўніцтва корпуса Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера. За гэты час рэканструяваны пямяшканні ў дзевяці ўстановах аховы здароўя горада з наступнай устаноўкай у іх камп'ютарных тамографаў.

## Галоўнае сёлета — дабудаваць

Агульны аб'ём фінансавых сродкаў, прадугледжаных інвестпраграмай на бягучы год, складае 853,1 млн рублёў. З гэтай сумы плануецца прыцягнуць 200 мільёнаў крэдытных рэсурсаў банкаў для будаўніцтва трэцяй лініі метро, 78,6 млн рублёў будзе накіравана на пагашэнне працэнтаў і асноўнага доўгу па раней выдадзеных крэдытах. «Такім чынам, на капітальнае будаўніцтва сёлета застаецца 574,5 млн рублёў, а гэта на 20 % менш, чым летась», — сказала Ірына Гонтарава.

Фінансаванне скарочана ў асноўным за кошт таго, што закладваецца менш праектаваных аб'ектаў. Асноўным прынцыпам гэтай праграмы з'яўляецца канцэнтраванне бюджэтных сродкаў на тых аб'ектах, якія ўводзяцца ў эксплуатацыю ўжо ў гэтым годзе ці крыху пазней.

Найбольш фінансуемыя галіны — транспарт (30 %), ахова здароўя (20 %), адукацыя (16 %), інжынерна-транспартная інфраструктура раёнаў жылой забудовы (17 %), добраўпарадкаванне (12 %). На гэтыя сферы дзейнасці



накіроўваецца каля 95 % усіх сродкаў. У транспартным кірунку толькі на будаўніцтва аб'ектаў Мінскага метрапалітэна плануецца накіраваць 231 млн рублёў. У сферы аховы здароўя плануецца ўвесці 14 аб'ектаў на суму 154 млн рублёў з бюджэту горада Мінска. У прыватнасці, гэта новы будынак 9-й дзіцячай паліклінікі на 290 наведванняў у змену, дзіцячая паліклініка ў мікрараёне Сухарава на 480 наведванняў у змену, амбулаторыя ў ВК «Лазурыт», корпус Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера (засталася закупка абсталявання) пасля рэканструкцыі, будынак дзіцячай інфекцыйнай клінічнай бальніцы (4-я чарга), цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі па вуліцы Сямашкі. Працягнецца будаўніцтва шэрагу пераходных аб'ектаў з тэрмінамі ўводу і ў 2022 годзе.

У стадыі праектавання няшмат аб'ектаў аховы здароўя, але яны ёсць. Гэта дзіцячая і дарослая паліклінікі ў складзе комплексу «Minsk World» і дзіцячая паліклініка на 480 наведванняў у мікрараёне Лошыца-9. Акрамя таго, у цяперашні час вядзецца праектаванне двух інтэрнатаў для медыцынскіх работнікаў — у граніцах вуліц Галадзеда і Веры Харужай.

## На адукацыю — нават больш

Ірына Гонтарава заўважыла, што на праектаванне і ўзвядзенне 37 аб'ектаў адукацыі за кошт бюджэту горада плануюцца інвестыцыі ў аб'ёме 120 млн рублёў, а гэта значна больш, чым у мінулым годзе (98,8 млн рублёў — у 2020-м)

Гэтыя грошы будуць накіраваны на будаўніцтва ўстаноў дашкольнай і сярэдняй адукацыі ў складзе эксперыментальнага комплексу «Minsk World», у раёнах жылых забудоў Масюкоўшчына, Лошыца-9, Лебядзіны, а таксама на рэканструкцыю дзевяці міжшкольных стадыёнаў. Усе гэтыя аб'екты плануецца ўвесці ў эксплуатацыю сёлета.

Ірына Гонтарава таксама ўдакладніла, што такія стадыёны (футбольнае поле са штучным пакрыццём, бегавыя дарожкі, пляцоўкі для заняткаў іншымі гульнявымі відамі спорту, трыбуны, пляцоўкі для магчымай устаноўкі мабільных раздзявальняў) з'явяцца ў кожным раёне сталіцы. Сёлета павінны быць уведзены ў эксплуатацыю пяць школ: № 23 па генплане ў межах пр. Дзяржынскага — пр. Любімава, у мікрараёне Лошыца-9, у складзе дзіцячага тэхнапарка ў квартале «Магістр», пасля рэканструкцыі гімназіі № 25 па вуліцы Сядова і будынка па вуліцы Цікоцкага, 57 (у мэтах размяшчэння ў ім кадэцкага вучылішча). Будзе будавацца адзін пераходны аб'ект — школа ў квартале № 18 жылога комплексу «Minsk World».

З фінансуемых па інвестпраграме 14 дашкольных устаноў сёлета будуць уведзены толькі дзве — дзіцячы сад у квартале № 19 ВК «Minsk World» і дзіцячы сад № 28 па генплане ў мікрараёне Масюкоўшчына-5. Таксама будзе ўведзены цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Ранак». Акрамя таго, ажыццяўляецца праектаванне двух дзіцячых садкоў і адной школы на спецыяльным участку для сталіцы ў Смалявічах.

Значна скарацілася фінансаванне такога кірунку, як фізічная культура і спорт. Летась было 16,1 млн рублёў, а на гэты год запланавана толькі 5,9 млн рублёў. Гэтыя грошы будуць накіраваны на ўзвядзенне інжынерна-транспартнай інфраструктуры для басейна міжнароднага стандарту па вуліцы Кальварыйскай і нацыянальнага футбольнага стадыёна ў межах Партызанскага праспекта і плошчы Ванеева. Таксама завяршаецца будаўніцтва тэнісных кортаў па вуліцы Жудро, 40.

## Другі горад-спадарожнік

Старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Аляксей Быкаў адзначыў на прэс-канферэнцыі, што ў бягучым годзе галоўны кірунак камітэта — перасяліць грамадзян, якія пражываюць у старых і аварыйных дамах, у новае камфартабельнае жыллё. А потым ужо пераключыць увагу на сацыяльнае і арэнднае жыллё.

А арэнднае жыллё ў Мінскай вобласці, у адрозненне ад сталіцы, будуецца не толькі за кошт сродкаў, што атрымліваюцца ад арэнднай платы жыхароў ужо ўведзеных дамоў. Укладваюцца і сродкі абласнога бюджэту.

Аляксей Быкаў удакладніў, што гаворка не цалкам аб арэндных дамах, а аб асобных кватэрах у шматкватэрных дамах. «Акрамя таго, цяпер ёсць магчымасць накіраваць сродкі ад арэнды на рамонт кватэр, каб потым выдзяляць іх у арэнду работнікам сацыяльнай сферы. Думаю, гэта будзе больш запатрабавана», — дадаў спецыяліст.

Таксама ў кожным райцэнтры падрыхтаваны схемы для комплекснай забудовы з інжынернай інфраструктурай — індывідуальныя дамы ў іх затым прапануюцца для маючых патрэбу. «Гэта перспектыўны кірунак», — падкрэсліў кіраўнік камітэта па архітэктуры і будаўніцтве.

У гарадах-спадарожніках Мінска абласныя ўлады таксама будуюць дамы і сацыяльныя аб'екты, паколькі бачаць, што прыцягненне сталічных інвестыцый ажыўляе рэгіён, а значыць, робіць яго прывабным і для мясцовых жыхароў.

Попыт на кватэры ў горадзе-спадарожніку Смалявічы паказаў, што гэты кірунак паляпшэння жыллёвых умоў для чаргавікоў са сталіцы з'яўляецца перспектыўным: заявак на тры новыя жылыя дамы ў гэтым населеным пункце паступіла ў шэсць разоў больш, чым прапаноўвалася кватэр. Ёсць план дэталёвай планіроўкі мікрараёна, заказчыкам выступае УКБ Мінгарвыканкама. Другі кірунак — Рудзенск у Пухавіцкім раёне, дзе рэалізуецца буйны праект ЗАТ «БНБК», ён дасць новыя рабочыя месцы. Менавіта Рудзенск прапанаваны Мінску як наступная для асваення пляцоўка ў якасці горада-спадарожніка.

## Міні-садкі не «прыжыліся»

Убудаваныя ў шматкватэрныя жылыя дамы дзіцячыя садкі малой плошчы менш запатрабаваныя ў насельніцтва, чым асобныя аб'екты. Ірына Гонтарава заявіла, што горад сёння пачынае адмаўляцца нават ад малагабарытных садкоў на 190 месцаў, будуюцца большыя — на 230 месцаў і нават на 350. У горадзе ўжо быў пабудаваны эксперыментальны міні-садок — там занадта дорага.

Старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама растлумачыла гэта тым, што эксплуатацыйныя выдаткі, аплата работы персаналу ў дзіцячым садку малой плошчы вышэйшая. «Дастаткова праблематычна потым абслугоўваць такія ўбудаваныя аб'екты ў складзе жылых дамоў. Павялічваюцца выдаткі на ўтрыманне. І не для ўсіх жыхароў шмадпавярховікаў такое суседства зручнае», — сказала Ірына Гонтарава.

Да таго ж патрэба ў дзіцячых дашкольных установах настолькі вялікая, што іх магчымасці нават у межах аднаго квартала, мікрараёна павінны быць значныя.

У сваю чаргу Аляксей Быкаў звярнуў увагу на спецыфіку забудовы ў раёнах. «У асноўным гэта пяціпавярховыя дамы або індывідуальная забудова. Убудаваны дзіцячы садок у пяціпавярхоўцы эканамічна нявыгадны, а характар індывідуальнай забудовы гэтага зусім не прадугледжвае. Іншая справа — такія аб'екты, як аптэкі і амбулаторыі», — дадаў Аляксей Быкаў.

## Кожнаму раёну — па басейне

**Намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінаблвыканкама Уладзімір ГУБАРЭВІЧ** адзначыў, што ўсе спартыўныя аб'екты ў рэгіёне карыстаюцца попытам. Так, уведзены ў 2020 годзе ў Мар'інай Горцы плавальны басейн за няпоўныя пяць месяцаў паспела наведаць больш за 13 тысяч чалавек. Прычым не толькі жыхары Пухавіцкага раёна, але і прыезджыя.

«У інвестыцыйнай праграме вобласці на 2021—2025 гады запланавана будаўніцтва плавальных басейнаў, у выніку чаго такія аб'екты з'явяцца ў кожным раёне вобласці», — сказаў Уладзімір Губарэвіч.

Таксама летась была ўведзена лыжаролерная траса ў Салігорску, шматфункцыянальная спартыўная пляцоўка ў Дзяржынску, футбольныя міні-пляцоўкі са штучным пакрыццём у рамках рэалізацыі сацыяльнага праекта ў гарадах Беразіно, Крупкі, Капыль і Чэрвень. Адкрыты ролер-трэк у Салігорску і ў пачатку гэтага года — крыты тэнісны манеж на тэрыторыі спарткомплексу «Шахцёр».

Будзьце пільныя!

# Ашуканцы атакуюць праз месенджары

## Як захаваць свае грошы?

**У апошні час у нашай краіне ўчасціліся выпадкі махлярства ў дачыненні да трымальнікаў банкаўскіх картак. У тым ліку зламыснікі выкарыстоўваюць папулярныя месенджары, каб звязвацца з кліентамі розных банкаў. Толькі з пачатку года ў Беларусі з боку Viber было заблакавана больш за 3 000 акаўнтаў з прыкметамі махлярства, на якія паскардзіліся жыхары нашай краіны. У сувязі з гэтым спецыяльныя праграмы папярэджваюць сваіх карыстальнікаў аб рызыках і нагадваюць, як засцерагчы сябе ў выпадку зносін з ашуканцамі.**

Часцей за ўсё ашуканцы тэлефануюць карыстальнікам з падробленых акаўнтаў розных банкаў і прадстаўляюцца іх супрацоўнікамі (вядомыя выпадкі, калі зламыснікі называлі сябе прадстаўнікамі Беларусбанка). Пры гэтым у якасці фатаграфіі такога акаўнта выкарыстоўваюць лагатып банка, а назва акаўнта ў месенджары ідэнтычная назве банка. У працэсе зносін зламыснікі рознымі шляхамі імкнуцца даведацца ў карыстальнікаў даныя іх банкаўскіх картак.

Кампанія Rakuten Viber нагадвае, што катэгарычна нельга перадаваць суразмоўцам у месенджарах:

- даныя сваёй карткі: нумар, тэрмін дзеяння, CVV-код;
- любы PIN-код;
- лагін і пароль ад інтэрнэт-банкінгу;
- пароль 3D Secure;
- SMS-пароль.

Ні ў якім разе не варта раскрываць даныя вашай банкаўскай карткі, кім бы ні прадстаўвіўся ваш суразмоўца: супрацоўнікам банка або прадстаўніком любых іншых арганізацый. У выпадку атрымання падобных званкоў у месенджары варта спыніць размову і патэлефанаваць па нумары, указаным на афіцыйным сайце вашага банка або на адваротным баку вашай банкаўскай карткі.

Вы таксама можаце адзначыць нумар тэлефона махляра як «Спам» у праграме. Для гэтага скарыстайцеся некалькімі рэкамендацыямі месенджараў. Спачатку адкрыйце дыялогавае акно з гэтым карыстальнікам. Зразумела, што адпраўніка няма ў вашым спісе кантактаў, таму праграма адразу ж прапануе вам функцыю «Дадаць у кантакты» — не рабіце гэтага. Для блакавання непажаданага карыстальніка вы можаце выбраць «Гэта спам» або «Заблакаваць»: яго акаўнт будзе заблакаваны ў абодвух выпадках. Пры пэўнай колькасці такіх адзнак карыстальнікаў аб тым, што профіль займаецца спам-рассылкай ці фэйк-званкамі, гэты карыстальнік будзе заблакаваны і не зможа больш нікога патурбаваць у месенджары.

Вы таксама можаце перадаць інфармацыю аб падробленым запісе ў службу падтрымкі. Для гэтага:

- зрабіце скрыншоты нумара тэлефона, пры дапамозе якога з вамі звязваўся зламыснік у Viber;
- перайдзіце на сайт help.viber.com/ru/contact;
- у адкрытым акне запоўніце форму зваротнай сувязі, расказаўшы аб праблеме і прымацаваўшы скрын.

Месенджары імкнуцца даць сваім карыстальнікам магчымасць для зручных і бяспечных зносін, дзе б яны ні знаходзіліся. Усе чаты Viber абаронены скразным шыфраваннем па змаўчанні. Гэты спосаб перадачы даных мае на ўвазе, што толькі карыстальнікі, якія ўдзельнічаюць у зносінах, маюць доступ да кантэнту. Ключы шыфравання захоўваюцца ў тэлефоне карыстальніка і ніхто староннi не можа атрымаць да іх доступ. Viber таксама не захоўвае кантэнт на сваіх серверах — усе паведамленні пасля дастаўкі адрасату выдаляюцца.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# Вар'ят, сын скупечы: трагедыя князёў Масальскіх

**Вялікі гетман Міхал Масальскі праводзіў цэлыя дні, гладзячы дукаты і перамываючы талеры**



**Мы з вамі неаднойчы гаварылі пра прывідаў беларускіх замкаў... Аднак ёсць на Беларусі замак, які і сам называюць прывідам — а менавіта Ляхавіцкі. Калісьці магутны, прыгожы, а сёння нават месца, дзе ён знаходзіўся, дакладна не вызначана...**

А колькі ў ім усяго адбывалася! Будавалі замак Хадкевічы, належаў ён Сапегам... Вытрымліваў аблогі, прырастаў вежамі, бастыёнамі і неверагоднымі гісторыямі. Быў сярод ягоных пазнейшых уладальнікаў і той, хто мог бы таксама зрабіцца прывідам, а яшчэ прататыпам да пушкінскай трагедыі «Скупы рыцар». Так, персанаж адметны... Вялікі гетман літоўскі, староста віленскі.... Ды яшчэ пражыў ледзь не сто гадоў — на той час, а гэта васямнаццатае стагоддзе, амаль неверагоднае доўгажыхарства! Пры тым яснавяльможны Міхал Масальскі росту быў маленькага, ды яшчэ зусім шчуплы... Затое амбіцый ды энергіі мелася ў невялічкага пана з лішкам! Менавіта Міхал узвысіў свой род, сабраўшы незлічоныя багацці, займаючы адна за адной пасады, хаўруснічаючы то з аднымі палітычнымі партыямі, то з другімі... Як піша мемуарыст Лявон Патоцкі, «Амбітны і хцівы, ён чаго захацеў, тое атрымаў або жалезнай воляй, або з дапамогай спрыяльных акалічнасцяў, якія ўмеў выкарыстаць».

## Госці едуць? Хаваемся!

Праславіўся ж ягамосць пан Масальскі не толькі амбіцыйнасцю, але і неверагоднай сквапнасцю. Як піша Патоцкі, *«найбольш ён цешыўся з таго, што ў параўнанні з князем Каралем Радзівілам сукна на кунтуш яму трэба было на адзін локаць менш. А на доктара і аптэку за ўсё жыццё нічога не выдаў»*.

Калі пан сыходзіў з імшы, замест таго каб шчодра ахвяраваць на касцёл грошы, казаў, што ахвяруе малітву, а Пан Бог хай яму самому дасць талераў бітых, найбольш галандскіх. Нават на світу сваю асабліва не траціўся — і плаціў мала, і карміў дрэнна, хоць было іх у мэтах эканоміі ўсяго з дзясятак. Так што прыдворныя склалі жаласную песеньку пра свайго сквапнага гаспадара, за якім даводзілася цягацца ва ўсе падарожжы, а ён карміў адным крупнікам:

*«Мы да Палонгі — крупнік за намі!*
*Мы да Мышы — крупнік за намі!*
*Мы да Слоніма — крупнік за намі!*
*Ад катла чорнага выбаў нас, Пане!*
*Ад гетмана нашага збаў нас, Пане!»*

І гэта ўсё ў час, калі магнатэрыя спаборнічала ў марнатраўстве ды пышнасці баляў, калі вяселле альбо хаўтуры расцягваліся на год і дзеля пачастунку шляхты на кожны соймік выстаўляліся бочкі віна ды забіваліся валы, а разам з феерверкамі ўзляталі ў неба цэлыя вёскі — у грашовым эквіваленце... Калі шляхта жыла па святым сармацкім прынцыпе «Госць у дом — Бог у дом» і частаваць трэба было «з прымусам», пакуль апошні госць пад стол не зваліцца... Падчас калядных карнавалаў практыкавалі кулігі — цэлы караван шляхцюкоў ездзіў ад сядзібы да сядзібы. Аб'ядуць аднаго гаспадара да мышынага віску, забіраюць яго з сабою — і ў наступны маёнтак!

Яснавяльможны Міхал Масальскі ўвогуле ў госці ездзіць пазбягаў і да сябе нікога не запрашаў.

І вось уявіце сітуацыю: пану Міхалу паведамляюць, што да яго едзе сам Караль Радзівіл Пане Каханку! А той меў з сабою заўсёды не менш за сто чалавек світы. Зусім не пусціць у маёнтак нельга... Шчуплы Масальскі загадаў слугам сказаць прыхадням, што пана няма дома, а сам замітусіўся, не ведаючы, куды схавацца. Як апавядае гістарычны анекдот, самым надзейным месцам яму падалася... прыбіральня.

Між тым Пане Каханку ліслівцы-дабразычліўцы са смехам пра ўчынак гетмана далажылі і нават паказалі схованку. Караль Радзівіл, як вядома, асаблівым тактам не вызначаўся, наадварот, быў аматарам грубаватых жарцікаў. Таму з задавальненнем папёрся проста да дзвярэй прыбіральні і давай грукацца, нібыта самому ўзнікла пільная патрэба. Давялося Масальскаму ў рэшце рэшт выйсці... Абодва магнаты зрабілі выгляд, быццам адбылося непаразуменне, і вось як Лявон Патоцкі апісвае іх дыялог:

«— Мне казалі, што пана няма дома, — адзываецца весела госць.

— Ёсць, — жаласным голасам адказвае гаспадар.

— Калі так, — дадае той, — то запрошваюся да вашэці на трыднёўку, падчас якой, калі будзе ласка, папалюем у яго кнеях, у спіжарні і склепах!

— Вядома, прашу заходзіць, — перапалоханы вялікі гетман Вялікага Княства Літоўскага прамовіў так ціха, што яго словы ледзьледзь можна было пачуць».

## Клетка для Крысціны Ружы

Маларослы Міхал Масальскі меў чатырох сыноў і дачку, чые лёсы планаваў на карысць роду.

Адзін з сыноў, Юзаф, ажаніўся з Антоніяй Радзівіл, дачкой аб'яўленага вар'ятам князя Марціна Радзівіла. Князь Марцін захапіўся алхіміяй і таемнымі навукамі так, што сапраўды глузды паехалі. Каб прыпадобніцца старажытным мудрацам, выяўляў з сябе ў маёнтку Чарнаўчыцы ўсходняга ўладыку, завёў гарэм з няшчасных «кадэтак» — дзяўчатак хапалі па навакольных вёсках. А законную жонку, Бялхацкую, з дзецьмі, Антоніяй і Юзафам, трымаў у зняволенні, ледзь не на хлебе і вадзе. Юзаф вырас гарбатым з-за пабояў бацькі. Антоніі, старэйшай з дзяцей, пашанцавала — яе за тры гады да абвяшчэння бацькі недзеяздольным, у пятнаццацігадовым узросце выдалі замуж за Юзафа Масальскага. Безумоўна, пастараўся пан Міхал.

Другі яго сын, Ігнацы, быў скіраваны па духоўнай частцы — зрабіўся біскупам віленскім.

Трэці сын, Ян, пайшоў у войска, памёр бяздзетным. Мусіць, менавіта да яго адносяцца чуткі, што быў гулякам, распуснікам і марнатраўцам, бо ўзненавідзеў бацькавую прагу да грошай.

Ну а старэйшаму сыну, Казіміру, якому мусіў дастацца маярат, бацька, відаць, падбіраў нявесту неверагодна пільна — той ажаніўся ў 1746 годзе, на год пазней за Юзафа. Не мела значэння, зразумела, што Казімір быў непаглядны знешне — удаўся ў бацьку: малы, шчуплы, непрыгожы, ды яшчэ з хваравітаю скурай. Але, падобна, не меў бацькавага загартаванага характару ды магутнага здароўя.



Месца, дзе, магчыма, стаяў Ляхавіцкі замак.

У нявесткі Міхал Масальскі абраў Крысціну Ружу Сапегу — адну з самых зайздросных нявест. У пасаг за ёй давалі Ружаны. А Ружанскі палац — гэта рэзідэнцыя не горш за каралеўскую, уладальнік меў правы называцца графам.

Натуральна, ні жаніха, ні нявесту асабліва аб схільнасцях не пыталі.

## Будоўля на слязах і крыві

І вось Казімір Адрыян Масальскі прывёз маладую жонку ў Ляхавіцкі палац. Кажуць, што скупеча Міхал нават вяселле як след не зладзіў. Ні табе стрэлаў з гармат, ні балю. Зрэшты, вось што піша пра спосаб жыцця старога гетмана той жа Лявон Патоцкі (веры, праўда, яму, як і кожнаму белетрысту-рамантыку, не варта даваць шмат, прынамсі, ён блытае Казіміра Адрыяна з ягоным братам Юзафам).

*«Сцены яго ляхавіцкага замка былі голыя, мэбля надзвычай сціплая, служба хадзіла ў несамавітым адзенні, і толькі падчас побыту ў сталіцы або падчас сеймаў надзявала гетманскія ліўрэі, якія не абнаўляліся на працягу ўсяго жыцця іх пана. Еў ён раз на дзень. А стол яго нязменна складаўся з супу і двух блюдаў, хоць бы да яго завітаў самы рэдкі і найдастойнейшы госць. І толькі тады на стале з'яўлялася адна бутэлечка слабога віна, бо звычайна ён піў толькі ваду, як сцвярджаў, «для здароўя». Калі ж дзесьці выязджаў, дык чатырохконнаю каляскаю. На стайні ён трымаў не больш за дванаццаць коней. Верхавога ніводнага, бо належаў да таго шэрагу гетманаў, якія на каня ніколі не садзяцца»*.

Дарэчы, ці не была такая стрыманасць прычынай моцнага здароўя гетмана? Бо добрым тонам тады лічылася жэрці тлустае колькі ўлезе, ды са спецыямі, ды віном наліваючыся... Дзіва што ў мемуарах шляхцюкоў ўвесь час скардзяцца, што пакутуюць на страўнік, пячонку, ныркі...

Багатай спадчынніцы Крысціне Ружы адвялі цэлае крыло замка, але ў вялізных паўпустых змрочных пакоях наўрад ці яна пачувалася ўтульна. Тым больш што муж асаблівай увагі ёй не ўяўляў, бавячыся на паляваннях. Ды яшчэ ўзяўся перабудоўваць жончыны Ружаны, запрасіў дзеля гэтага каралеўскага архітэктара Яна Дэйбеля. І праяўляў сябе сынам свайго бацькі. Гісторык Пракаповіч сцвярджае, што каб здабыць грошай на будоўлю ў Ружанах, мясцовых сялян абклалі нечуванымі падаткамі — адных толькі грашовых пабораў было больш за пяцьдзясят. Плацілі за ўсё: за карыстанне ўласнымі жорнамі, за выраб алкагольных напояў, за права выйсці замуж у іншае графства, за карыстанне лесам. Жыхарам Ружанаў забаранілі ўваходзіць у пушчу, секчы дровы: «Нікому, ні пад якім выглядам без асобага дазволу гаспадара ці камісараў ягоных не выдаваць з лесу ніводнага сучка».

Мусіць, Крысціна не магла дачакацца, пакуль будоўля скончыцца і яна назаўсёды з'едзе з Ляхавіцкага замка.

## Апошняе паляванне князя Казіміра

Але здарылася страшная гісторыя. Казімір Масальскі быў запрошаны ў Нясвіж, на паляванне да Радзівіла Пане Каханку.

Уласна кажучы, запрашалі ягонага бацьку — але стары гетман, натуральна, адмовіўся. Ну яго, марнатраўства гэтае, ды яшчэ, не дай Гасподзь, зноў Пане Каханку прыцягнецца пасля гасцяваць.

Адносіны паміж Масальскімі і Радзівіламі былі, як вы разумееце, складаныя. З аднаго боку, вечныя палітычныя ворагі, з другога, як уся магнатэрыя, у сваяцтве і час ад часу ў вымушаным хаўрусе. Жаніцьба Казіміра на Крысціне Ружы была косткай у радзівілаўскім горле, бо Радзівілы сваталі Крысціну за свайго родзіча. Пане Каханку яшчэ асабліва не любіў Масальскіх, бо тыя мелі дачыненне да расстрэлу ў Мінску ягонага ўлюбёнца і канфідэнта, пана Міхала Валадковіча.

Дык вось, паляванне пачалося ў дзень Святога Губерта, адных загоншчыкаў — мясцовых мужыкоў — было з тысячу. Казімір Масальскі жадаў паказаць сваю зухаватасць, бо лічыў сябе спрактыкаваным паляўнічым, хартоў улюбёных з сабою ўзяў... А тут і выпадак надарыўся: на Казіміра пайшоў вялізны мядзведзь. Масальскі стрэліў таму ў бок, але звер не ўпаў. Тады Казімір дастаў паляўнічы нож і падрыхтаваўся да бойкі... Але мядзведзя заваліў стрэлам гаёвы Сурвіла. Масальскі аддзячыў яму жменяй залатых манет.

Пане Каханку ўбачыў у гэтым здарэнні падставу высмеяць Масальскіх. І калі пасля палявання госці ўселіся за сталы, пахваліў мужнага Сурвілу за выратаванне «найбуйнейшай галіны гетманскага роду» (госці, паглядаючы на дробненькага Масальскага, сцішана рагаталі). А тады князь падарыў свайму гаёваму цэлы маёнтак і сто дукатаў.

Зразумела, Казімір быў прыніжаны і ўгневаны — ягоная жменька золата выглядала смешна ў параўнанні з Радзівілавай шчодрасцю, што адпавядала анекдотам пра скупасць Масальскіх. Казімір не застаўся на далейшыя забавы, адразу з'ехаў у свае Ляхавічы. Ясна, што быў страшэнна не ў настроі. Непадалёк ад дому кульгаваў жабрак, які прытуліўся на мосце, хацеў выпрасіць у пана міласціны, ды паваліўся на сваіх мыліцах. Конь Масальскага спалохаўся і скінуў гаспадара, а гаспадар, не бачучы свету ад гневу, спусціў на жабрака сабак...

Кажуць, адразу ж паспрабаваў іх адагнаць — позна. Харты раздзёрлі калеку, а Масальскі ў непрытомным стане вярнуўся ў бацькоўскі замак. Замкнуўся ў пакоі, ажно бацьку давялося загадваць узламаць дзверы. Ды яшчэ нібыта калі харты з акрываўленымі пысамі забеглі ў пакой да Казіміра, той закрычаў «Ратунку!» і знепрытомнеў.

Потым Казімір, кажуць, з дня ў дзень хадзіў на месца здарэння, на той самы мост. Звар'яцеў.

## Бітва за Ружаны

Крысціна год вазіла мужа па замежжы, у Варшаву, Берлін, Парыж, да найлепшых дактароў — дарэмна. Часамі той цяміў, а потым яму раптам пачынала здавацца, што яго цкуюць сабакамі, ён крычаў, хаваўся... Вось толькі прызнаваць яго вар'ятам іншыя Масальскія не жадалі — бо гэта дало б права Крысціне Ружы атрымаць развод і забраць свае Ружаны... Чаго, натуральна, больш за ўсё і жадалі Сапегі. Пачаліся доўгія суды-сяды... Крысціна пераехала да сястры Ганны, якая была замужам за навагрудскім ваяводам Юрыем Радзівілам, а калі, урэшце, з дапамогай канцлера Чартарыйскага атрымала развод, сышла ў віленскі кляштар бернардынак. Яна памерла ў 1772 годзе (у некаторых крыніцах — у 1774-м).

Казімір дажыў да 1766-га. Кажуць, прычынай смерці было тое, што калі ён па звычцы прыйшоў на мост, убачыў там нейкага жабрака з мыліцамі і вырашыў, што гэта прывід забітага...

Міхал Масальскі перажыў амаль усіх сваіх дзяцей. У 1762-м, калі памёр вялікі гетман Міхал Казімір Рыбанька, Масальскі з падтрымкай ворагаў Радзівілаў — Чартарыйскіх забраў гэту пасаду ў сына Рыбанькі, Пане Каханку. Да гэтага Міхал быў гетманам польным літоўскім, гэта трохі меншая пасада. А ў 1764-м менавіта ён запрасіў у Рэч Паспалітую расійскія войскі, каб падтрымалі абранне каралём стаўленіка Чартарыйскіх Станіслава Панятоўскага.

Памёр Міхал Масальскі ў 1768 годзе, Ляхавічы дасталіся ягонаму сыну, Ігнацыю, біскупу віленскаму. Апошнія гады гетмана праходзілі так, паводле Лявона Патоцкага: *«цэлымі днямі гуляў, разгладжваючы дукаты і перамываючы талеры. Каля яго ложка стаяла вялікая бочка, напоўненая дукатамі, укладзенымі так хітра, што хоць адзін бок бочкі быў адкрыты, дастаць іх адтуль ніхто не мог»*.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Памяць і гонар

# Узыходжанне Іосіфа Ходзькі



Памятная дошка, усталяваная да 220-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Ходзькі ў аг. Крывічы.

**Я веру, што калі мы навучымся чытаць уласную гісторыю па лёсах людзей, зможам лепш разабрацца ў тым, што такое Беларусь і хто мы ёсць. Якія моцныя людзі нараджаліся на нашай зямлі! Яны пакаралі свет сваімі ведамі, адкрыццямі, рашучасцю, адказнасцю... Чарговы раз у гэтым пераканалася падчас сустрэчы з чалавекам, што адкрыў для мяне яшчэ адно імя — геадэзіста Іосіфа (Язэпа) Ходзькі.**
**Дацэнт кафедры геадэзіі і аэракасмічных геатэхналогій БНТУ, кандыдат тэхнічных навук, інжынер-астраномагеадэзіст Уладзімір МКРТЫЧАН шмат гадоў прысвяціў вывучэнню і папулярызацыі гісторыі беларускай геадэзіі.**

Мой суразмоўнік родам з паўднёвай Грузіі. У 1976 годзе па размеркаванні трапіў у Беларусь, разлічваў адпрацаваць два гады. З тых часоў, як сам жартуе, так і адпрацоўвае. У Беларусі абзавёўся сям'ёй, сёння яго ўнук вучыцца ў беларускамоўнай школе. У яго жыцці было багата экспедыцый: Камчатка, Сахалін, Курылы, Сібір, Каракумы і мноства іншых. Але ён быў уражаны прыродай нашай краіны. І гісторыяй, бо нідзе не сустракаў зямлі, больш пакутлівай за Беларусь.

## Даследаванні пачынаюцца са здзіўлення

— Было, пры выкананні геадэзічных работ ідзеш па лесе і раптам трапляеш на камень, а на ім напісана, што тут забіта і пахавана тысяча чалавек. Прайшоў далей — бачыш другі камень, дзе пазначана колькасць расстраляных, — згадвае Уладзімір Ваганавіч. Ён упэўнены, што нельга жыць у краіне і не ведаць яе мовы, гісторыі, культуры, традыцый. — Я не мог застацца ўбаку. Я не гісторык, не пісьменік, не журналіст, а звычайны геадэзіст, і тое знайшоў магчымасць настолькі вывучыць беларускую геадэзію, што гэта вылілася ў дзве кнігі, якія я выдаў, па гісторыі беларускай геадэзіі. Беларусь — зямля, што вырасціла многіх выдатных людзей. Колькі іх мы яшчэ не ведаем, ведаем недастаткова ці мала даследавалі!»

***— А ці патрэбныя гэтыя веды для падрыхтоўкі будучых кадраў для навукі?***

— Ніводная нацыянальная навука немагчымая без асвятлення вопыту тых людзей, якія шмат для яе зрабілі. Так, мы кажам пра высокі ўзровень беларускай геадэзіі. Без імёнаў, без біяграфій, без даследавнняў у дадзеным накірунку гэта толькі дэкларацыя. Апошняя кніга, якую я напісаў — «Іосіф Ходзька. Генерал. Геадэзіст. Чалавек». Наколькі гэта глыбінная асоба, з якой трагічнай біяграфіяй! Я студэнтам распавядаю і пра геадэзічную Дугу Струвэ, і пра біяграфію Ходзькі. Калі б вы ведалі, з якой цікавасцю яны слухаюць! З раскрытым ротам! На перапынак пасля званка не хочуць сыходзіць — каб больш даведацца. Сучаснай моладзі гісторыя Беларусі цікавая.

***— Дзіўна, як даследаванні, зробленыя 200 гадоў таму, не супадаюць з сучаснымі ўсяго на пару сантыметраў. Як удалося дасягнуць такіх дакладных вымярэнняў, калі не было спадарожнікаў і складанага абсталявання?***

— Як прафесійны геадэзіст магу сказаць, што гэта незразумела і спецыялістам. Тады работы выконваліся з дапамогай прымітыўных чатырохметровых жэзлаў. Маё меркаванне: сакрэт крыецца ў высокай культуры, адказнасці, дысцыпліне і адносінах да сваёй справы. І я захапляюся гэтай работай, якую мае калегі — сапраўдныя героі сваёй справы, здзейснілі 200 гадоў таму.

**«Многія аўтарытэтныя вучоныя лічаць, што работы Ходзькі больш цэнныя, чым напрацоўкі Эверэста».**

У 1999 годзе я працаваў кіраўніком рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства аэракасмічных метадаў геадэзіі «Белаэракосмагеадэзія», і мы пачалі пошукава-даследчыя работы па праграме ЮНЕСКА «Геадэзічная Дуга Струвэ». Я быў адказным выканальнікам Беларусі ў гэтым праекце. Мы правялі вялікія пашпяховыя даследчыя работы і знайшлі з 31 пункта геадэзічнай Дугі Струвэ на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь 19 пунктаў. Ніводная краіна, праз якую праходзіць геадэзічная дуга (а іх дзесяць: Нарвегія, Швецыя, Фінляндыя, Расія, Эстонія, Латвія, Літва, Беларусь, Малдова, Украіна), такіх вынікаў не дасягнула. Мы паказалі высокі клас сучаснай беларускай геадэзіі. І тады, калі я стаў пісаць кнігу пра пошукава-даследчыя работы «Геадэзічная Дуга Струвэ. Шлях да сусветнага прызнання» (кніга была перакладзена на англійскую мову і стала даступная многім нашым партнёрам з-за мяжы), упершыню сутыкнуўся з імем Ходзька. Унёсак яго відавочны. Дуга Струвэ пачалася з сувязі градусных вымярэнняў, гэтую работу выканаў Іосіф Іванавіч Ходзька.

## Ідэя нарадзілася на Беларусі

Геадэзічная Дуга Струвэ, гэтак жа як і Мірскі замак, з'яўляецца помнікам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. А спытайце пра яе на вуліцы ў мінакоў — адзінкі будуць ведаць, што гэта такое.

Геадэзічная Дуга Струвэ ўзнікла выпадкова. На тэрыторыі Беларусі пасля Напалеонаўскіх войнаў усім стала зразумела, што ніводную ваенную кампанію выйграць немагчыма, не маючы дакладных тапаграфічных карт, а іх трэба ствараць на аснове дакладных геадэзічных сетак. І ўпершыню стварэнне такіх карт пачалі з заходніх рубяжоў Расійскай імперыі ў 1816 годзе пад кіраўніцтвам палкоўніка Карла Іванавіча Тэнера. На тэрыторыі Беларусі, развіваючы сеткі для стварэння дакладных тапаграфічных карт, па сваёй ініцыятыве ён праводзіў градусныя вымярэнні па мерыдыяне Віленскай абсерваторыі з мэтай удакладнення формы і памераў Зямлі.

У гэты ж перыяд у Ліфляндыі (тэрыторыя сучаснай Эстоніі) расійскі вучоны, астраном, геадэзіст Васіль Якаўлевіч Струвэ выконваў такія ж градусныя вымярэнні. Тэнеру прыйшла ідэя аб'яднаць гэтыя работы, каб атрымаць больш шырокія даныя — чым даўжэй градуснае вымярэнне, тым дакладней можна вывучаць параметры Зямлі. І гэтая ідэя прыйшла да яго на беларускай зямлі!

Пасля, дзякуючы аўтарытэту Струвэ, Дуга была падоўжана на поўнач да Паўночнага Ледавітага акіяна праз Фінляндыю, Швецыю і г. д. А Тэнер працягнуў гэтыя работы на поўдзень да Чорнага мора. І ў выніку грандыёзнага праекта XIX стагоддзя атрымалася самае доўгае ў свеце вымярэнне дугі мерыдыяна працягласцю ў амаль тры тысячы кіламетраў. Было закладзена больш за дзве сотні геадэзічных пунктаў. Дуга Струвэ прызнаная помнікам, які мае агульначалавечае і навуковае значэнне.

Беларускія вучоныя змаглі распрацаваць алгарытмы, каб знайсці 19 пунктаў геадэзічнай Дугі Струвэ, што было даволі няпроста. Час хаваў старыя пункты, даводзілася шукаць і пад зямлёй. Да таго ж нашы даследчыкі аказалі дапамогу малдаўскім калегам па пошуку такіх жа пунктаў на іх тэрыторыі.

— Я ўпэўнены, што Беларусь з'яўляецца радзімай геадэзічнай Дугі Струвэ. Тут Карлу Іванавічу Тэнеру ў галаву прыйшла геніяльная ідэя, — заўважае Уладзімір Ваганавіч. — На адной з міжнародных канферэнцый я выступіў з гэтым меркаваннем. Многія скрывіліся, але ніхто не ўступіў у палеміку са мной. Па сутнасці, уклад Беларусі быў прызнаны.

## Шлях наверх

Калі Уладзімір Мкртычан пачаў вывучаць біяграфію Ходзькі, многія акалічнасці яго ўразілі. Уладзімір Ваганавіч вырас у Грузіі, у адной з вёсак, дзе была вялікая гара, на якой ён прападаў цэлымі днямі. Пазней у архівах знайшоў звесткі, што камень з насечкамі, на якім ён адпачываў у дзяцінстве на «сваёй» гары, — геадэзічны пункт, вызначаны Іосіфам Ходзькам.

Іосіф Іванавіч Ходзька родам з Крывіч (сёння Мядзельскі раён). Менавіта побач з Крывічамі быў першы геадэзічны пункт на тэрыторыі Беларусі, які давялося зафіксаваць Уладзіміру Ваганавічу.

— Канешне, гэта выпадковасць, хоць у глыбіні душы я думаю, што ёсць рэчы, якія мы не можам зразумець, растлумачыць, — прызнаецца мой суразмоўнік.

Іосіф Ходзька нарадзіўся 220 гадоў таму ў сям'і выдатнага педагога, пісьменніка, грамадскага і палітычнага дзеяча Яна Барэйкі-Ходзькі — чалавека неардынарнага, які ахвяраваў усім дзеля ідэі нацыянальна-вызваленчага руху і ў выніку памёр у нястачы... Дарэчы, кожны з Ходзькаў заслугоўвае асобнай увагі.



Схема трыянгуляцыі Закаўказскага краю.

Іосіф нарадзіўся ў багатай, дружнай, глыбока рэлігійнай сям'і, атрымаў выдатнае дамашняе навучанне, паступіў ва ўніверсітэт у Вільні. Там сышоўся з Адамам Міцкевічам, уступіў у тайнае таварыства філаматаў, многія ўдзельнікі якога пасля былі пакараныя, адпраўлены ў выгнанне, у тым ліку і бацька Ходзькі — Ян Барэйка. Іосіфа ж ад ссылкі ці турмы выратоўвае Карл Тэнер, да якога таленавіты малады даследчык трапляе на службу.

У 1830 годзе, калі пачалося паўстанне, бацька Ходзькі і ўсе яго браты ўзялі ў ім актыўны ўдзел. Іосіфа паўстанцы планавалі назначыць ваенным камендантам Вільні, а ён у той час знаходзіўся ў шэрагах расійскай арміі. Паўстанне было падаўлена, многія рэпрэсіраваны, і, калі б не Тэнер, Ходзька таксама мог пацярпець. Тэнер тэрмінова накіроўвае яго ў Малдавію. Пасля Іосіф Іванавіч прыязджае на службу на Каўказ з задачай выканаць трыянгуляцыю краю. Для многіх аўтарытэтных ваенных і геадэзістаў гэта задача тады здавалася невыканальнай, і справа не толькі ў складаных фізіка-геаграфічных умовах. Гэта была зона ваенных дзеянняў.

— Трыянгуляцыя Закаўказскага краю — галоўнае дасягненне ў жыцці Ходзькі. Не буду казаць пра ўсе цяжкасці, якія былі. Але калі я чытаў, што ён рабіў як прафесійны геадэзіст, разумеў: калі б цяпер гэту задачу даручыць сучасным геадэзістам, якія маюць найноўшае абсталяванне, — паверце, калі яны яе і выканаюць, то з цяжкасцямі. Адным з галоўных дасягненняў праекта з'яўляецца выкананне геадэзічных вымярэнняў і ўзыходжанне на біблейскую гару Вялікі Арарат. Іосіф арганізаваў экспедыцыю ўжо ў чыне палкоўніка і ўзначаліў яе. Мне ўвесь час здавалася: навошта? У такім чыне можна было проста даць каманду падначаленым, але ён сам узнімаўся на гару, пяць сутак адзін быў на вяршыні. Выконваў геадэзічныя вымярэнні — і больш за тое, капаў на вяршыні глыбокую канаву. Не ўсе яго больш маладыя паплечнікі вытрымалі ўмовы той экспедыцыі. Так, яго памочнік, паручнік Павел Аляксандраў, пасля экспедыцыі памёр. Перад смерцю паклікаўшы дзяжурнага афіцэра, ён перадаў таму кавалак каменя з Арарата з просьбай захаваць як вялікую каштоўнасць. Я ўпэўнены, што Ходзька як глыбока веруючы чалавек на біблейскай гары шукаў сляды Ноева каўчэга.

Ходзька ўсё сваё жыццё ганарыўся гэтым узыходжаннем...

## Моцны духам

— Некаторыя моманты з біяграфіі, якія я агучыў у кнізе, так і не змог растлумачыць ні чытачу, ні сабе. Будучы ў чыне генерала-лейтэнанта ў адстаўцы, ён падымаецца на Дэўдаракскі ледавік гары Казбек, таму што з гэтага ледавіка сыходзяць лавіны і перакрываюць Ваенна-Грузінскую дарогу. І геадэзічныя работы, каб разабрацца з гэтай праблемай, ён рабіў у 74-гадовым узросце. Вось які быў чалавек!

У многіх публікацыях, якія датычыліся Іосіфа Іванавіча, было пазначана, што ён пахаваны на Петрапаўлаўскіх могілках горада Тбілісі. У 2005 годзе, знаходзячыся ў гэтым горадзе на канферэнцыі, я вырашыў наведаць могілкі, каб знайсці пахаванне Ходзькі. Нічога адшукаць не ўдалося, а дырэктар могілак пацікавіўся, што гэта за выбітны чалавек, якога ўсе шукаюць. Аказалася, што напярэдадні ён атрымаў ліст з Літвы з просьбай знайсці магілкі «выдатнага літоўскага геадэзіста». І ўсё ж чый ён? Яго сваім вучоным лічаць і рускія, і грузіны, і армяне. І гэта добра! Ці не найлепшае прызнанне дасягненняў?

Спатрэбілася 15 гадоў пошукаў, і дзякуючы рабоце ў архівах, са старымі газетнымі публікацыямі, Уладзімір Мкртычан прыйшоў да высновы, што Ходзька быў пахаваны ў іншым месцы — на Кукійскіх каталіцкіх могілках на поўначы колішняга Тыфліса, і нават адшукаў яго магілу.

Калі возьмецеся чытаць біяграфію слыннага вучонага, хіба што зможаце знайсці, дзе ён пабываў і што зрабіў. І рызыкуеце ўпусціць вельмі важныя дэталі, якія характарызуюць гэтага чалавека. Ён даволі позна ажаніўся, не меў сваіх дзяцей. І разам з першай жонкай Стафаніяй узяў на выхаванне двух сірот. Акрамя таго, у іх сям'і жылі дзве сястры Стафаніі, якія аўдавелі, са сваімі дзецьмі, і яго родная сястра Сафія, якая таксама была ўдавой (пасля смерці Яна Ходзькі яна з дзецьмі засталася без сродкаў для існавання, і Іосіф забраў яе з Беларусі да сябе на Каўказ). Калі памерла Стафанія, Іосіф падзяліў сваю маёмасць, у тым ліку і грошы. Палову аддаў сёстрам Стафаніі...

Іосіф ніколі не забываўся пра Радзіму. Калі ў паважным узросце ехаў лячыцца ў Карлавы Вары, яго шлях заўсёды пралягаў праз Беларусь...

Гэтай зімой на радзіме Іосіфа Ходзькі ў Крывічах была ўрачыста адкрыта прысвечаная яму мемарыяльная дошка, у гэты ж час адбылася і прэзентацыя кнігі пра сусветна вядомага вучонага. Уладзімір Мкртычан выказвае падзяку кіраўнікам Дзяржкамітэта па маёмасці Андрэю Гаеву і Дзмітрыю Матусевічу за падтрымку ў выданні і ўшанаванне памяці выдатнага даследчыка. Ён упэўнены, што на гэтым не варта спыняцца. У той час калі Ходзька рабіў трыянгуляцыю Каўказа, аналагічнай работай на поўначы Індыі займаўся англійскі геадэзіст — па выніках той работы самая высокая гара свету была названая імем апошняга. Хоць многія аўтарытэтныя вучоныя лічаць, што работы Ходзькі больш цэнныя, чым напрацоўкі Эверэста.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.
**Продавец:** ОАО «СДСК» (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.
Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **10 февраля 2021 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72984, общей площадью 207,0 кв. м (здание склада одноэтажное из кирпича и железобетонных панелей), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6А | 17 280,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 342/С-72804, общей площадью 413,0 кв. м. (здание склада № 2 одноэтажное кирпичное), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Б | 32 832,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 342/С-74404, общей площадью 265,5 кв. м. (здание склада одноэтажное панельное), Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 6Г | 18 720,00 |
| 4 | Грузовой автобетоносмеситель МАЗ 533702 280 СМБ-249, 2006 г. в., рег. знак АК 8701-3, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10 | 10 944,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо в срок** с 27.01.2021 г. 09.00 по 09.02.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 22.12.2020 г.

# УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ОБУВЬТОРГ»

**26 февраля 2021 года** в кабинете директора по адресу:
г. Минск, ул. Платонова, 28
состоится **ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**!

**Начало собрания – 14.00.**
Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.
Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2020 год и перспективах развития Общества на 2021 год.
2. О работе наблюдательного совета ОАО «Обувьторг» в 2020 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Обувьторг» за 2020 год.
4. Об утверждении годового отчета и дополнения к учетной политике в целях бухгалтерского и налогового учета на 2021 год, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Обувьторг» за 2020 год.
5. Об утверждении распределения чистой прибыли за 2020 год.
6. О выплате дивидендов за 2020 год.
7. О сроке выплаты дивидендов за 2021 год.
8. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2021 году и I квартале 2022 года.
9. О выкупе ОАО «Обувьторг» части акций Общества в целях сокращения их общего количества.
10. О привлечении финансирования (инвестиций, кредита) с целью выкупа части акций Общества.
11. О залоге имущества ОАО «Обувьторг» в качестве обеспечения гарантий под привлечение финансирования (инвестиций, кредита) с целью выкупа части акций Общества.
12. О продаже имущества Общества стоимостью 50 и более процентов балансовой стоимости активов Общества.
13. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Обувьторг».
14. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни, начиная с 19 февраля 2021 года, по месту нахождения Общества.
Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра на 26 января 2021 года.

**Наблюдательный совет.**

УНП 100262652

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 411/С-13813 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 191,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58.
Лот 1 находится на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001167 (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина)), площадью 0,1022 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0134 га

**Начальная цена продажи – 4944 руб.**
(четыре тысячи девятьсот сорок четыре рубля) с учетом НДС.
**Сумма задатка – 494 руб.** (четыреста девяносто четыре рубля)

ЛОТ 2:
- капитальное строение, инв. № 411/С-15726 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – квасильно-засолочный цех), площадью 80,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А;
- сооружение, инв. № 411/С-15762 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – наружная сеть канализации), протяженностью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А.

Лот 2 находится на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001330 (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания здания квасильно-засолочного цеха)), площадью 0,0517 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А

**Начальная цена продажи – 1 515,60 руб.** (одна тысяча пятьсот пятнадцать рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС.
**Сумма задатка – 151 руб.** (сто пятьдесят один рубль)

ЛОТ № 3:
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14795 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки и табака 2 25 01, наименование – колбасный цех), площадью 407,5 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32;
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14796 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 70,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/1;
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14797 (назначение – здание специализированное иного назначения 2 29 00, наименование – насосная), площадью – 3,9 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/2;
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14798 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально – технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 11,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/3.

Лот 3 находится на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001155 (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания зданий насосной, колбасного цеха и двух складов)), площадью 0,1803 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1803 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0432 га

**Начальная цена продажи – 2 553 руб.**
(две тысячи пятьсот пятьдесят три рубля) с учетом НДС.
**Сумма задатка – 255 руб.** (двести пятьдесят пять рублей)

**Продавец –** Берестовицкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231778, г. п. Берестовица, ул. Советская, 2. Тел. 8-01511-750-90

**Организатор торгов –** Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 12 февраля 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **https://grino.by/aukcion/**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.12.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 10 февраля 2021 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71–*
*Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
**https://grino.by/aukcion/**

# Извещение о проведении 9 февраля 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-13331, общая площадь – 250,8 кв. м, наименование – столовая, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: одноэтажная кирпичная столовая с пристройкой 1, навесом 2, сараем 3, в том числе устройство стоянки на 10 автомобилей а1, металлическое ограждение столовой а2, водоотводной канал возле столовой а3, ограждение столовой а4, благоустройство территории вокруг столовой а5, система водоснабжения столовой а6, система канализации столовой а7, система наружного освещения, столовой а8; котел КЧУ-7-63А «Эффект» зав. № 3858 (инв. № 196338), система пожарной сигнализации столовой «Логоза» (инв. № 175819), система охранной сигнализации столовой «Логоза» (инв. № 175839) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Логоза, ул. Центральная, 1 |
| **Сведения о земельных участках** | Площадь – 0,1032 га, кадастровый номер 623284502604000021, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой;<br>площадь – 0,0148 га, кадастровый номер 623280806404000022, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой |
| **Продавец имущества** | ОАО «МТЗ», 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 29 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС** | 137 151,02 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 13 700,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 09.02.2021.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Торги проводятся **9 февраля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.01.2021 по 05.02.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (029) 363 38 42; (017) 333-49-67.
**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»).

# ВНИМАНИЕ

**Янушковичский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома 1 марта 2021 г. в 11.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельн. участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации, за рекламу |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 27А, кадастровый номер 623288001601000094, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2125 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 6000,00 | 1200.00 | 1356,96 + расходы за рекламу |
| 2 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 15А, кадастровый номер 623288001601000092, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1369 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 5000,00 | 1000.00 | 1356,96 + расходы за рекламу |
| 2 | д. Жабичи, У-3, кадастровый номер 623288005101000022, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2427 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 6000,00 | 1200.00 | 1356,96 + расходы за рекламу |
| 3 | д. Бориски, У-1, кадастровый номер 623288002101000012, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2228 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 5000,00 | 1000.00 | 1323,41+ расходы за рекламу |
| | д. Аскришино-У-1, кадастровый номер 623288000601000028, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2500 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 6000,00 | 1200.00 | 1356,96 + расходы за рекламу |
| | д. Серпищино, У-1, кадастровый номер 623288014101000036, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1958 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 5000,00 | 1000.00 | 1356,96 + расходы за рекламу |

Задаток перечисляется на р/счет: BIC AKBBBY2X; счет № BY35AKBB36006191711040000000 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.
Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

**Аукцион состоится 1 марта 2021 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10. Заявление на участие, квитанция об уплате задатка принимаются до 19 февраля 2021 г., при подаче заявления при себе иметь паспорт, удостоверяющий личность. Последний день подачи заявления – 19 февраля 2021 г. до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.**
**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, (8 01774) 57 4 99.**

Прыкметы часу

# ШТО ЖАВАЦЬ, КАБ НЕ ПЕРАЖЫВАЦЬ

## «Сумныя» прадукты — прэч з халадзільніка!

**Зіма і хандра ў нашых шыротах — сёстры-блізняты. Асабліва ў цяперашнія, поўныя стрэсаў і перажыванняў, часы. Каб не ўпасці ў тугу, мяняем рацыён харчавання з «сумнага» на «радасны».**

Апошнія 50 гадоў можна назваць «зорным часам» дыеталогіі. І ўвесь гэты час навукоўцы актыўна вывучалі ўзаемасувязь паміж рацыёнам чалавека і яго настроем — з пазіцый біяхіміі, фізіялогіі, псіхалогіі. Аказалася, што наш настрой непасрэдна залежыць ад той ежы, якую мы ўжываем кожны дзень. Дакладна і адваротнае сцвярджэнне: стан душы



таксама ўплывае на той набор страў, якія нам хочацца з'есці ў дадзены момант.

Сувязі паміж ежай і настроем складаныя, заблытаныя і вельмі індывідуальныя, на іх уплывае час сутак, узрост едака і харчовыя звычкі, якія сфарміраваліся яшчэ ў дзяцінстве. Але ж тут ёсць і агульныя законы.

### НЕ «ПЯЧЭНЬКА», А «ПЯЧАЛЬКА»

Як высветлілася, самыя сумныя людзі на свеце — аматары мюслі, «карысных» сухіх сняданкаў, батончыкаў-гранолы, кафеіназмяшчальных і газіраваных напояў «без цукру». Дадаюць негатыву таксама кансервы і фастфуд. У «сумным» спісе і салёныя сухарыкі і чыпсы. І наогул любыя прадукты з вялікім утрыманнем кансервантаў. Таксіны, назапашваючыся ў арганізме, забіраюць сілы і энергію. А кафеін правакуе прыступы раздражняльнасці. Акрамя таго, салёныя арэшкі, чыпсы і сухарыкі прыводзяць да звычкі есці «аўтаматычна» — гледзячы ў манітор ноўтбука падчас работы, за чытаннем або праглядам тэлепраграм і нават за рулём.

Здоба — булачкі і торцікі — таксама не дадаюць пазітыву (хоць за імі трывала замацавалася рэпутацыя антыдэпрэсантаў). Тэорыя аб тым, што вугляводная ежа можа аслабіць дэпрэсію і палепшыць настрой, была вынайдзена ў 1989 годзе. Сапраўды, спажыванне вугляводаў прыводзіць да павелічэння выпрацоўкі сератаніну. Сератанін — адно з самых важных біялагічна актыўных рэчываў у нашым арганізме. Выпрацоўваючыся ў тканцы галаўнога мозга з трыптафану (амінакіслаты, якая змяшчаецца, у прыватнасці, у вустрыцах, бананах, арэхах, малацэ, індычцы, ананасе, яйках, шпінаце), сератанін уплывае на мноства функцый: здаровы сон, добры настрой, рэгуляцыю апетыту, кантроль імпульсаў. І, як вынік, вугляводная дыета здольная палепшыць настрой. Але справа ў тым, што значная частка калорый пры ўжыванні прысмакаў — малочнага шакаладу, марожанага і булачак — пастурае ў наш арганізм у выглядзе тлушчаў. І на выпрацоўку сератаніну салодкія «антыдэпрэсанты» ўплываюць мала. А вось на памер таліі — яшчэ як! Што не дадае пазітыву. Словам, здольнасць хуткіх вугляводаў станоўча ўплываць на настрой чалавека ў апошні час аспрэчваецца. Разам з тым усе гэтыя пончыкі і вафелькі — бомба для нашага кішэчніка і вораг для нашай скуры. Трэба сказаць, што жанчыны ў большай ступені, чым мужчыны, схільныя да перападаў настрою, і менавіта ў прыгожага полу хутчэй развіваецца дэпрэсія. Напрыклад, дыетолагі адзначаюць, што падчас эксперыменту пасля ўжывання салодкіх прысмакаў (якія павінны былі падняць настрой) кароткі прыліў пазітыву і паніжэнне ўзроўню трывожнасці адзначала толькі мужчынская частка ўдзельнікаў. Жанчыны ж казалі аб санлівасці і зніжэнні настрою.

Традыцыйны «антыдэпрэсант» алкаголь таксама прыводзіць да адваротнага выніку, асабліва калі гэта моцны напой — ён прыгнятае нервовую сістэму.

«Сумнымі» можна назваць і любыя прадукты, смажаныя ў тлушчы. З'едзеная тлустая ежа адчуваецца як фізічны цяжар у кішэчніку, выклікае дыскамфорт і правакуе зніжэнне настрою.

### МЯНЯЕМ СУМ НА РАДАСЦЬ

Адчуваеце заняпад і «недахоп» настрою? Скарачаем колькасць «сумных» прадуктаў і страў у нашым рацыёне хоць бы напалову. І дадаём «радасныя», выкарыстоўваючы навуковы падыход — ужываючы прадукты з высокім утрыманнем вітамінаў і амінакіслот, якія хутка падымуць настрой.

*Сератанін* — як ужо гаварылася, «гармон радасці» (уплывае на правільную работу сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сістэм, а ўвечары трансфармуецца ў мелатанін, ад якога залежыць добры сон). Для яго выпрацоўкі ядзім павольныя вугляводы: кашы (у першую чаргу грэчкавую, прасяную, аўсяную), сыры і тварог, бананы, шакалад, часнок і рыбін тлушч.

*Фенілаланін* — рэчыва, неабходнае для выпрацоўкі эндарфінаў. Павышае фізічную актыўнасць і вынослівасць арганізма. Удзельнічае ў «спальванні» лішніх калорый і ачышчае арганізм ад шлакаў і таксінаў. Дадаём у рацыён бабовыя, арэхі, сметанковае масла, рыбу, курыцу, малако і тварог.

*Лецыцін* — дапамагае аднаўленню клетак (а ў здаровым целе, як вядома, здаровы дух. І добры настрой!). Ужываем чырвонае мяса (ялавічыну) і яйкі.

*Аргінін* — паляпшае настрой і павышае актыўнасць. Для яго дастатковай выпрацоўкі ядзім курыцу і свініну, рыс, яйкі, морапрадукты.

*Тыразін* — «змагаецца» са стрэсам і актыўна супрацьстаіць зніжэнню настрою. Утрымліваецца ў гарбузовых семечках, кунжуце, печані і рыбе.

*Вітамін С* — самы «жыццярадасны» з вітамінаў. Забяспечвае бадзёрасць і абараняе ад стрэсу. Налягаем на цытрусавыя, зялёную цыбулю, чырвоны перац, дадаём у рацыён квашаную капусту і памідоры.

Цяпер больш падрабязна спынімся на тых прадуктах, якія сучасная дыеталогія лічыць антыдэпрэсантамі.

Перш за ўсё гэта рыба. Але не любая, а яе тлустыя гатункі — палтус, ласось, скумбрыя, гарбуша, селядзец, сёмга, фарэль. Яны ўтрымліваюць Амега-3 — антыдэпрэсант, падораны людзям самой прыродай. Не любіце рыбу? Тады піце рыбін тлушч!

**Бананы —** утрымліваюць алкалоід, які выклікае прыліў радасці і пазітыву.

**Паста** (спагеці, тальятэле, фетучыні і звыклыя «ражкі») — выдатныя антыдэпрэсанты. Толькі выбірайце вырабы з цвёрдых сартоў пшаніцы. Яны багатыя на вугляводы і ўтрымліваюць карысныя для нервовай сістэмы вітаміны групы В. Дарэчы, да антыдэпрэсантаў адносяць і **кашы —** у першую чаргу грэчкавую, прасяную, аўсяную і ячную.

**Вострыя перац** (чылі, халапеньо, кайенскі) — таксама хутка падымае настрой. У адказ на «вастрыню» на языку наш мозг выпрацоўвае натуральны «абязбольвальнік» — эндарфіны. Невыпадкова ў краінах, дзе вострыя перац стабільна ўваходзіць у рацыён, людзі больш жыццярадасныя, чым у нашых паўночных шыротах.

**Сыр** (лепш — цвёрдых гатункаў) таксама стымулюе выпрацоўку «гармону радасці». А кальцый у складзе прадукту стымулюе нашу разумовую дзейнасць.

**Арэшкі / семечкі —** утрымліваюць альфа-ліналевую кіслату, якая зніжае трывожнасць. А магній у іх складзе дапамагае арганізму выпрацоўваць сератанін.

**Салодкія прысмакі —** але не любыя! А ў першую чаргу натуральны мёд — наймацнейшы прыродны антыдэпрэсант і прафілактыка рэспіраторных інфекцый «у адным флаконе». І ў другую — горкі шакалад (можна замяніць кубачкам гарачай какавы). Какава-бабы ўтрымліваюць фенілэцыламін, які спрыяе выпрацоўцы эндарфінаў, гармонаў шчасця і задавальнення. А яшчэ ў складзе горкага шакаладу шмат магнію, які, як мы ўжо казалі, эфектыўна змагаецца са стрэсам.

### ЯДЗІМ ПА ПРАВІЛАХ

Каб ежа дастаўляла толькі станоўчыя эмоцыі, а традыцыйны «зімовы набор вагі» вас не закрануў, памятаем аб правілах: раўнавазе паміж энергіяй, якая пастурае з ежай, і энергіяй, якая расходуецца, збалансаванасці рацыёну і захаванні рэжыму харчавання. Імкнёмся да такога рэжыму харчавання, каб ад першай да апошняй за суткі трапезы прайшло не больш за 8 гадзін.

— Для таго каб прыём ежы быў максімальна карысны, падчас прыёму ежы важна выключыць крыніцы стрэсу і адцягваючыя фактары. Прыём ежы павінен быць павольны і ўсвядомлены, — кажа **навуковы супрацоўнік аддзела харчавання НПЦ па харчаванні НАН Беларусі Ганна ЖУРНЯ.**

Хуткая ежа — гэта паглынанне прадуктаў з хуткасцю каля 100 г у хвіліну, сярэдняя — каля 80 г/хв, павольная — каля 65 г/хв. Правільная — менавіта павольная. Рэжам страву на дробныя кавалачкі, робім паўзы (калі нічога няма ў роце!), адкладваючы прыборы.

Працяглая тэрмічная апрацоўка ежы вядзе да павелічэння глікемічнага індэкса, зніжэння ўтрымання фітанутрыентаў, вітамінаў, мінералаў, амінакіслот. Так што лепш за ўсё даводзіць прадукты да стану al dente, гатаваць мяса на пары, а каранеплоды варыць цалкам.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Актуальна

# Пластыкавы посуд па-за законам

**Штогод, па інфармацыі Сусветнага фонду дзікай прыроды, у Сусветны акіян трапляе з рэк і сушы (пры няправільным захоўванні адходаў) ад 5 да 12 мільёнаў тон пластыку. Пад уздзеяннем вады, сонца і сутыкненняў адно з адным ён ператвараецца ў мікрапластык, які марскія жывёлы прымаюць за планктон і харчуюцца ім. Далей па харчовым ланцужку ён можа трапіць і ў арганізм чалавека.**



З гэтай і іншых прычын маштабнае выкарыстанне пластыку з'яўляецца глабальнай сусветнай праблемай. У Беларусі яе спрабуюць вырашаць шляхам пераходу на экалагічную ўпакоўку і адмаўлення ад палімернай. Прынамсі, з 1 студзеня 2021-га ўведзена забарона на продаж і выкарыстанне пластыкавага посуду ва ўстановах грамадскага харчавання.

Летась у Беларусі назапасілася каля 280 тысяч тон адходаў пластмас, з іх каля 182 тысяч утварылася ў межах вытворчасці. У краіне вызначаны 132 найменні пластыкавых адходаў і зарэгістраваны 196 аб'ектаў па выкарыстанні 92 найменнняў пластыкавых адходаў. У год яны агулам здольны перапрацаваць каля 113 тысяч тон пластыкавага смецця. Мяркуецца, што да 2030 года ў краіне створаць 30 міжрэгіянальных аб'ектаў па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, дзе будзе прадугледжана ў тым ліку і кампаставанне.

Трапляючы ў зямлю, адходы пластыку распадаюцца на дробныя кавалачкі і могуць выдзяляць у асяроддзе атрутныя хімічныя рэчывы, якія дадаваліся ў пластык падчас яго вырабу. Небяспечныя рэчывы трапляюць у грунтавыя воды і забруджваюць іх. А так званы біяраскладальны пластык падчас распаду можа выдзяляць метан — моцны парніковы газ, які робіць істотны ўнёсак у глабальнае пацяпленне, расказаў **Максім ТАРАСАЎ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці — начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя.**

Замяшчэнне пластыкавай упакоўкі бяспечнай экалагічнай, у тым ліку тарай са шкла і паперы, — адзін з крокаў па пераадоленні «пластыкавай праблемы» ў Беларусі. Пастановай урада № 7 у краіне зацверджаны план мерапрыемстваў, скіраваных на паэтапнае зніжэнне выкарыстання пластыкавай упакоўкі.

— *Планам прадугледжана рэалізацыя 19 мерапрыемстваў у розных галінах. Гэта ўдасканаленне сістэмы абыходжання з адходамі, скарачэнне выкарыстання пластыкавай упакоўкі, навуковыя даследаванні, тэхнічнае рэгуляванне і скарачэнне імпарту пластыкавай упакоўкі,* — адзначыў спецыяліст. — *Пералік пластыкавага посуду, які забаронены для продажу ў аб'ектах харчавання, зацверджаны МАРГам і ўключае відэльцы, лыжкі, нажы, палачкі для размешвання напояў, «саломінкі», талеркі, кубачкі, а таксама ўпакоўку для прадукцыі грамадскага харчавання і харчовых прадуктаў, у тым ліку латкі, ланч-боксы, кантэйнеры, корэксы, банкі, бутэлькі. Выключэнне толькі для ўпакоўкі кулінарных паўфабрыкатаў і кандытарскіх вырабаў.*

Ва ўсіх гандлёвых аб'ектах павялічаны шэраг пакетаў з паперы для продажу і мінімізаваны пералік пластыкавых. Паўсюдна прысутнічаюць безалкагольныя напоі ў шкляной тары рознага фармату.

У краіне запланавана распрацоўка шэрагу дзяржстандартаў у галіне ўстанаўлення патрабаванняў да экалагічна бяспечнай упакоўкі, у тым ліку біяраскладальнай. Акадэмія навук плануе правесці комплекс даследчых работ па вызначэнні найбольш перспектыўных экалагічных кірункаў, а таксама эканамічнай мэтазгоднасці атрымання біяраскладальных матэрыялаў і ўпакоўкі з іх. Вядзецца таксама пошук альтэрнатыўных варыянтаў замяшчэння пластыкавай упакоўкі, укараненне новых перспектыўных тэхналогій па стварэнні і вырабе біялагічна бяспечных і біяраскладальных варыянтаў упакоўкі, дадаў Максім Тарасаў:

— *Цяпер не ідзе гаворка аб поўнай імгненнай адмове ад выкарыстання пластыкавай упакоўкі. Гэта паэтапная работа, скіраваная на змяншэнне выкарыстання палімернай упакоўкі з яе замяшчэннем экалагічна бяспечнай. Асноўным у гэтым кірунку з'яўляецца грамадскае ўсведамленне праблемы. Важна, каб у кожнага з'явілася асабістае жаданне і імкненне да гэтага.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Рэдкая прафесія

# Бландзінкі за... шпільцішам

## Карэспандэнт «Звязды» зазірнуў углыб аргана

**У Віцебскай абласной філармоніі тыя, хто ўпершыню прыходзяць паслухаць арган, або даўно не чуў гукі «караля інструментаў», здзіўляюцца, што выканаўцы — прывабныя дзяўчаты. Напярэдадні зімніх свят карэспандэнт «Звязды» ацаніў выкананне арганістак — Веранікі БАГДАНОВІЧ-ЯЗВІНСКАЙ і Кацярыны ІВАНОВАЙ.**

### НЕ КОЖНАМУ ДАДЗЕНА

Дзяўчаты, канешне, ганарацца тым, што іграюць на самым вялікім інструменце ў свеце. У ВНУ, дарэчы, выкладчыкі адразу іх папярэдзілі, што не ўсе, напрыклад піяністы, могуць стаць арганістамі. У прыватнасці, як ні стараўся адзін хлопец, як кажуць пра такіх, з талентам ад Бога, ну ніяк не мог асвоіць арган. Як пажартавалі мае суразмоўніцы, так, не ўсім дадзена. Навучыцца кіраваць гіганцкім інструментам вельмі цяжка. Напрыклад, паралельна трэба іграць рукамі і нагамі. І часта прыходзіцца «круціцца» падчас выканання, як вавёрка ў коле. Напэўна, гэта і ёсць гарантыя захавання фігуры. Дзяўчаты стараюцца рэпеціраваць па дзве-тры гадзіны штодня, калі не ў філармоніі, то на «міні-аргане» ў вучылішчы. Пры гэтым, кажуць, не стамляюцца, а адпачываюць, бо арган, быццам бы сапраўдны чараўнік, дорыць шмат карыснай энергіі. Такое адчуванне, што вырастаюць крылы...

Прыгажуні-гераіні паралельна — выкладчыцы Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Салярцінскага. Навучэнцы пры іх дапамозе асвойваюць электронны арган.

Веранікі 27 гадоў. Яна нарадзілася ў Нясвіжы.



У 2018 годзе скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі.

Маладая арганістка — удзельніца Акадэміі старадаўняй музыкі ў Грацы (Аўстрыя) у 2016-м і у 2018-м у Мінску, майстар-класаў Трумэра (Аўстрыя), Прайзнера (Польшча), Шмітава (Расія).

Удзельнічае ў праграмах арганнай музыкі для дзяцей у Віцебскай абласной філармоніі. Летась падрыхтавала сольную праграму «Касмічнае падарожжа: працяг».

Кацярыне 26 гадоў, яна родам з Віцебска. Скончыла тую ж сярэднюю спецыяльную ўстанову каледжа



імя Салярцінскага. Таксама яна выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, з'яўляецца дыпламантам XIV Адкрытага фестывалю арганнай музыкі (Гатчына — Санкт-Пецярбург), навучэнка Акадэміі старадаўняй музыкі ў Грацы (Аўстрыя), удзельніца V Міжнародных арганных асамблей (Калінінград), майстар-класаў Трумера (Аўстрыя), Пірхонена (Фінляндыя), Зілінга (Германія), Ле Прадо (Францыя), Прайзнера (Польшча), Шмітава (Расія). Кацярына вядзе актыўную канцэртную дзейнасць, брала ўдзел у шэрагу фестываляў арганнай музыкі.

### ІНШАПЛАНЕЦЯНЕ ПАЧУЮЦЬ АРГАН

Дзяўчаты маюць шмат прыхільнікаў. У прыватнасці, вельмі папулярны канцэрт арганнай музыкі «Касмічнае падарожжа» для дзяцей і падлеткаў. Ён стаў цудоўным падарункам не толькі для іх, але і для дарослых. Музыка, у тым ліку з папулярных фільмаў пра пакарэнне нябёсаў, цікавыя падсветка ў зале і на сцэне, паказ кінафрагментаў нікога не пакідаюць раўнадушнымі. Дарэчы, музыка самага вядомага кампазітара арганнай музыкі, Баха, была запушчана ў космас. Яна запісана на славутым залатым дыску, які адправіўся ў бясконцае вандраванне паміж зоркамі на касмічным апараце «Вояджэр». Такім чынам, арган — адна з візітных картак нашай планеты.

Спецыяльная музычна-пазнавальная праграма канцэртаў «У гасцях у караля» знаёміць з гісторыяй паходжання, прыладай і тэхнічнымі магчымасцямі самага грандыёзнага і велічнага з усіх музычных інструментаў — аргана. Вядучая канцэрта ў займальнай форме расказвае ўсю гісторыю арганнай музыкі ад яе вытокаў і да нашых дзён. І, вядома, юныя слухачы маюць магчымасць атрымаць асалоду ад чароўных гукаў гэтага караля музычных інструментаў. У зале Віцебскай абласной філармоніі, акрамя Баха, гучыць музыка Букстэхудэ, Шуберта і іншых кампазітараў. Выканаўцы дэманструюць асаблівую прыгажосць, моц і багацце гучання аргана.

У Віцебскай абласной філармоніі ў 2007 годзе быў устаноўлены па-сапраўднаму ўнікальны музычны інструмент — духавы арган нямецкай фірмы Glatter-Gotz. Гэта другі ў Беларусі інструмент (пасля Беларускай дзяржаўнай філармоніі), размешчаны не ў культавай



установе. Духавы арган спраектаваны па індывідуальным праекце з улікам акустычных магчымасцяў залы і архітэктурных асаблівасцяў будынка філармоніі. Адметная канструкцыйная асаблівасць віцебскага аргана Glatter-Gotz — гэта спалучэнне гучання французскіх познерамантычных інструментаў і нямецкага рамантычнага аргана. Так званую інтаніроўку (настройку) праводзіў французскі майстар Жан Франсуа Дзюпон.

### ЗОРКІ БЫЛІ Ў ЗАХАПЛЕННІ

Вядомыя арганісты свету, якія выступалі ў філармоніі, адзначылі, што віцебскі арган з'яўляецца цікавы паводле свайго дызайну. Ён размешчаны ў выглядзе дзвюх вежаў па краях сцэны. У адсеках-калонах знаходзіцца 3000 (!) драўляных і металічных труб, якія ўяўляюць сабой сплаў волава і свінцу. Для корпуса аргана, драўляных труб і пульта арганіста выкарыстана драўніна буку, дубу, бярозы, елкі. У аргане 36 рэгістраў, што дазваляе выконваць музыку любых стыляў і кірункаў. У пульце арганіста два мануалы (па 58 клавіш), а таксама нажная клавіятура з 30 клавіш. Паветра ў арган падаецца з двух кампрэсараў, размешчаных у аркестравай яме. Пульт арганіста абсталяваны магутным камп'ютарам, здольным запамінаць да 4000 камбінацый рэгістраў.

Адкрыццё аргана ў зале Віцебскай абласной філармоніі адбылося 6 ліпеня 2007 года ва ўрачыстай абстаноўцы і прысутнасці кіраўніка дзяржавы. З гэтага часу віцебскі арган рэгулярна знаёміць сваіх слухачоў з шэдэўрамі сусветнай арганнай класікі розных стыляў, жанраў і кірункаў у выкананні вядомых выканаўцаў розных нацыянальных школ. Арганныя канцэрты набылі папулярнасць і сталі неад'емнай часткай культурнага жыцця горада.

На віцебскім аргане ігралі вядомыя выканаўцы з Францыі, Аўстрыі, Германіі, Швецыі, ЗША, Польшчы, Фінляндыі, Латвіі, Літвы, Расіі, Беларусі. «Гэта дзівосны арган! Велізарнае задавальненне працаваць з ім», — падзяліўся ўражаннямі Рональд Эбрэхт з ЗША. «Арган выдатны, яркі, гучны. Вельмі адчувальны, што патрабуе ад выканаўцы гранічнай канцэнтрацыі і дакладнасці. Граць на ім — асалода!» — заўважыў Аляксандр Ісакаў з Літвы. «Іграючы на аргане, я атрымаў велізарнае задавальненне. Канцэпцыя незвычайная, нечакана распяхова пры дадзенай акустыцы. Гэта было выдатнае пачуццё — сядзець «у цэнтры» аргана і адчуваць арганную музыку з абодвух бакоў... Я не ўяўляю, што лепшае можна было б зрабіць для гэтай залы!» — канстатаваў Ханс Фагіус са Швецыі.

«Здзіўлены, наколькі гэта добры інструмент! Мару, што ён зменіць да лепшага гісторыю арганнага мастацтва Беларусі!» — вельмі эмацыянальна выказаўся Расціслаў Выграненка з Польшчы.

Пра музычную тэрапію чулі многія. Мае чароўныя суразмоўніцы ўпэўненыя, што музыка Баха і душу лечыць, і целу дапамагае аднавіць сілы. Нездарма ў філармоніі раяць паслухаць арган цяжарным. Віцябляне, дарэчы, у гэтым былі першапраходцамі ў краіне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Фота з асабістага архіва герaінь публікацыі.**

**• У тэму**

❍ У перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы арган азначае «інструмент», «прылада». А яго пульт афіцыйна мае назву «шпільціш». Правобразам аргана даследчыкі музыкі лічаць вавілонскую дуду (XIX стагоддзе да н. э.).

❍ У «сям'і» арганаў паводле іх функцыянальнай прыналежнасці ёсць канцэртны, царкоўны, тэатральны, кінаарган (апошні выкарыстоўваўся для агучвання нямых фільмаў), кірмашовы, камерны (партатыўны, салонны) і іншыя. Існуюць экзатычныя разнавіднасці аргана, як, напрыклад, паравы, «гідраўлафон» і архітэктурнае збудаванне ў Харватыі пад назвай «Марскі арган», на якім іграюць хвалі марской вады. Арган канцэртнай залы Бардуок у Атлантык-Сіці, ЗША — самы вялікі і самы гучны сярод калі-небудзь створаных музычных інструментаў. Мае сем мануалаў (клавіятура для рук), 455 рэгістраў і 33 112 труб. Даўжыня самай вялікай трубы складае каля 18 метраў.

Вытокі

# «Каложскі Благавест» і «Слонімскія цудадзействы»

**Выяўленне і зберажэнне элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны — важная задача для спецыялістаў Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.**

Супрацоўнікі аддзела традыцыйнай культуры ўпэўнены, што пакуль будуць перадавацца з пакалення ў пакаленне элементы народных танцаў, сакрэты роспісу велікодных яек, рэцэпты аўтэнтычных страў, таямніцы старажытных абрадаў, дагэтуль наша фальклорная спадчына будзе заставацца надзейным падмуркам для грамадства будучага.

Ва ўстанове са шматгадовай гісторыяй беражліва захоўваюць і развіваюць традыцыйную культуру, ладзяць маштабныя святы, аказваюць падтрымку аматарскай творчасці Гродзеншчыны. Тут ёсць усё: фальклор, тэатр, музыка, танец, спевы, выяўленчае і прыкладное мастацтва. Летась у Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці, якому споўнілася 80 гадоў, фактычна было сканцэнтравана ўсё культурнае жыццё вобласці.

### Таямніцы абрадаў і сакрэты рукатворнай прыгажосці

Дзякуючы зладжанай рабоце цэнтра ў вобласці адбылася безліч яркіх фестываляў, многія з якіх сталі візітнай карткай усёй краіны. Гродзенская зямля па праве можа ганарыцца адным з вядучых праваслаўных фестываляў свету — «Каложскім Благавестам». Крэатыўнымі ідэямі штогод папаўняецца вечна малады фестываль «Не старэюць душой ветэраны». Упэўнена заяўляюць аб сабе мясцовыя зоркі сцэны падчас традыцыйных «Лідскіх тэатральных сустрэч» і «Слонімскіх цудадзействаў». На працягу амаль 15 гадоў не страчвае сваю актуальнасць фестываль фальклору «Панямоння жыватворныя крыніцы». І ўсё гэта — толькі невялікі пералік безумоўных культурных брэндаў, да якіх мае дачыненне калектыў Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.

Амаль паўвека таму ў сценах метадычнага цэнтра сямейнай дынастыяй Шунейкаў былі ўдасканалены кросны і адноўлена ткацтва тэматычных габеленаў. Унікальная майстэрня працуе і сёння, дзякуючы метадысту выставачнай залы Алене Феліксаўне Шунейцы — пераемніцы бацькавай тэхнікі падвойнага і пераборнагааднабаковага ткацтва, што ўваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

Яшчэ адна гордасць абласнога цэнтра — выставачная зала, у якой за гады яе існавання была арганізавана больш за 500 унікальных экспазіцый. Салома- і лозапляценне, вышыўка, ганчарства, разьба па дрэве, выцінанка, жывапіс — сюды даўно «пратапталі сцежку» гродзенскія аматары рукатворнай прыгажосці.

### Да новых вяршынь і далягядаў

Варта сказаць, што работа цэнтра — не толькі святы, перамогі і выдатны настрой публікі. Гэта таксама бясконцы творчы пошук, пазапланавыя сходы, карпатлівая праца па суправаджэнні кожнага, хай невялікага, але ад гэтага не менш значнага мерапрыемства.

Гродзенскі цэнтр народнай творчасці заслужана можна назваць сапраўдным рухавіком разнастайных творчых працэсаў, якія адбываюцца ў рэгіёне. На жаль, складаная эпідэмічная сітуацыя не дазволіла адсвяткаваць юбілей установы масава. Тым не менш



культурнае жыццё вобласці цалкам на паўзу не пастаўлена.

Абапіраючыся на назапашаны за гады вопыт, маючы ў скарбонцы безліч смелых ідэй і праектаў, творчыя спецыялісты цэнтра будуюць упэўненыя планы. Інакш немагчыма, бо ў іх падтрымцы маюць патрэбу каля 1500 калектываў аматарскай творчасці; па метадычную і практычную дапамогу цэнтра звяртаюцца работнікі культуры з усіх куткоў вобласці. А, як вядома, калі хтосьці адчувае сябе карысным і патрэбным людзям, то любая работа ў яго спорыцца і проста гарыць у руках.

**Ала БЯЛЬКЕВІЧ,**
**дырэктар Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.**

# У ЛІСАБОНЕ БЕЗ ПЕРАМЕН



## У Партугаліі пераабралі прэзідэнта

**Адной з ключавых падзей мінулых выхадных сталі прэзідэнцкія выбары ў Партугаліі, якія прайшлі ў нядзелю. Паводле інфармацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі краіны, 72-гадовы правацэнтрыст Марселу Рэбелу дэ Соўза атрымаў каля 61 працэнта галасоў выбаршчыкаў. Гэта яшчэ больш, чым паказчык, які забяспечыў яму перамогу ў мінулы раз — пяць гадоў таму ён атрымаў 52 %. Вялікая ўвага да гэтых выбараў тлумачыцца ў тым ліку і тым, што з пачатку 2021-га да Партугаліі на паўгода перайшло старшынства ў Савеце Еўрасаюза. Як развіваліся падзеі?**

### Насуперак прагнозам

Напярэдадні сацыялагічныя апытанні прагназавалі вельмі нізкую яўку, мінімальную за апошнія дзесяцігоддзі — ад 20 да 30 працэнтаў — на якую магла паўплываць надзвычай цяжкая эпідэмічная сітуацыя ў краіне (перад галасаваннем было выяўлена амаль 12 тысяч выпадкаў заражэнняў COVID-19, 275 пацыентаў памерла). Сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса ў Партугаліі з насельніцтвам крыху больш чым 10 мільёнаў зараз самая цяжкая ў Еўропе.

Аднак песімістычныя прагнозы не апраўдаліся: ужо да 16.00 прагаласавала 35,44 % выбаршчыкаў (на мінулых выбарах у 2016 годзе да гэтага часу — 37,7 %). Даволі высокай яўцы ў цяперашніх умовах шмат у чым спрыялі заклікі палітыкаў, у тым ліку прэм'ера Антоніу Кошты і прэзідэнта, які выставіў сваю кандыдатуру на другі тэрмін.

«Ваш удзел — асноўнае для ўмацавання нашай дэмакратыі», — напісаў Кошта ў Twitter, дадаўшы, што не скарыстацца асноўным правам — «значыць дазволіць, каб іншыя вызначалі нашу будучыню». «У людзей застаецца яшчэ некалькі гадзін да завяршэння галасавання, каб прыйсці і прагаласаваць без якіх-небудзь праблем або клопату, што можа павярнуцца яўкай, якую не чакалі яшчэ тыдзень таму», — заявіў прэзідэнт краіны Марселу Рэбелу дэ Соўза журналістам на выхадзе з выбарчага ўчастка.

Гэта галасаванне параўноўвалі з вотумам даверу дзяржаўнай палітыцы ва ўмовах пандэміі і справакаванага ёю крызісу. Партугалія трапіла ў спіс краін, чыя эканоміка асабліва моцна пацярпела ад каранцінных абмежаванняў. Аналітыкі папярэджваюць, што гэта пагражае сур'ёзнымі сацыяльнымі праблемамі.

Дзеючы прэзідэнт заслужыў асаблівую павагу за тое, што канструктыўна супрацоўнічае з левацэнтрысцкім урадам, падтрымлівае стабільнасць у краіне. Паказальна, што дэ Соўзу, былога старшыню Сацыял-дэмакратычнай партыі, падтрымаў і лідар сацыялістаў, кіраўнік урада Антоніу Кошта.

Даныя апошніх перад выбарамі сацапытанняў сведчылі аб тым, што Марселу Рэбелу дэ Соўза, нягледзячы на крызіс, па-ранейшаму карыстаецца шырокай падтрымкай выбаршчыкаў.



За яго гатовыя былі прагаласаваць амаль дзве трэці апытаных цэнтрам даследавання грамадскай думкі Eurosondagem. Аднак нізкая яўка магла сыграць супраць дзеючага кіраўніка дзяржавы, павялічыўшы шанцы на другі тур. Другое месца на гэтых выбарах аспрэчвалі лідар крайне правай партыі Chega! Андрэ Вентура і прадстаўніца левага крыла сацыялістаў, колішні дыпламат і еўрадэпутат Ана Гомеш. Усяго свае кандыдатуры на гэтых выбарах выставілі сем палітыкаў.

Каб гарантаваць бяспеку выбаршчыкаў і пазбегнуць збору людзей, улады адкрылі дадатковыя ўчасткі — усяго іх працавала больш за 12 тысяч па ўсёй краіне, была закуплена вя-



лікая колькасць антысептычных геляў. Выбаршчыкі павінны былі прыходзіць у масках, выконваць сацыяльную дыстанцыю і прынесці з сабой ручку для запаўнення бюлетэня. У выніку на многіх участках у Лісабоне і Порту выстраіліся чэргі. Было праведзена датэрміновае галасаванне 17 студзеня, у дамы састарэлых прывозілі урны, каб пажылым людзям не даводзілася выходзіць на вуліцу.

### Фактар пандэміі

Прэзідэнт Партугаліі, які абіраецца на агульнанацыянальных выбарах раз у пяць гадоў, валодае даволі шырокімі паўнамоцтвамі: у яго ёсць права накладваць вета на законы, якія прымаюцца парламентам, ён дае даручэнне таму ці іншаму лідару партыі фарміраваць урад, можа склікаць выбары і распускаць парламент, паведаміла РІА «Навіны». Для перамогі ў першым туры неабходна атрымаць больш за 50 працэнтаў галасоў. Калі ніводнаму кандыдату не ўдасца гэтага зрабіць, то праз 21 дзень праходзіць другі тур, у якім возьмуць удзел кандыдаты, якія занялі першыя два месцы.

На гэты раз усё адбылося ўжо ў першым туры.

Прычым дзеючы кіраўнік дзяржавы быў пераабраны з вялікім адрывам ад супернікаў. Другое месца на гэтых выбарах заняла прадстаўніца Сацыялістычнай партыі Ана Гомеш — яна атрымала каля 13 працэнтаў галасоў, толькі нязначна абышоўшы Андрэ Вентуру, лідара крайне правай ліберальна-кансерватыўнай партыі Chego!, утворанай у 2019 годзе. Астатнія кандыдаты набралі менш чым 5 працэнтаў галасоў. Вентура павіншаваў прыхільнікаў з перамогай над камуністамі, якія не трапілі ў першую тройку. «Гэтая ноч запомніцца адным — тым, што мы разграмілі крайне левую партыю ў Партугаліі», — заявіў ён.

Яўка на гэтых прэзідэнцкіх выбарах апынулася трохі ніжэйшая, чым пяць гадоў таму. Гэта тлумачыцца ў тым ліку апасеннямі партугальцаў за сваё здароўе падчас пандэміі.

Марселу Рэбелу дэ Соўза атрымаў юрыдычную адукацыю, працаваў юрыстам, пасля журналістам. У 1974 годзе ўступіў у Сацыял-дэмакратычную партыю. У 1981-м стаў дзяржсакратаром Савета міністраў, затым — міністрам па пытаннях узаемадзеяння з парламентам. Балаціраваўся на выбарах 2016 года, дзе перамог з вынікам 52 %.

У сваёй прамове пасля таго, як сталі вядомыя вынікі выбараў, дэ Соўза заявіў, што партугальцы хочуць як мага хутчэй адолець пандэмію каранавіруса, аднавіць рабочыя месцы і даходы, змагацца з беднасцю, а таксама мець стабільную палітычную сістэму з моцным і вартым даверу кіраўніцтвам, паведаміла партугальская кампанія грамадскага тэле- і радыёвяшчання RTP. Ён назваў барацьбу з пандэміяй самай важнай на сённяшні дзень задачай. «Мы павінны рабіць усё, што ад нас залежыць, каб спыніць, а затым павярнуць назад працэс, які аказвае сур'ёзны ціск на нашы структуры аховы здароўя», — дадаў прэзідэнт.

Пра пачатак трэцяй хвалі пандэміі раней заявіў прэм'ер-міністр Партугаліі Антоніу Кошта. Паводле яго слоў, у сувязі з паказчыкамі захварэльнасці на ковід і смяротнасці інфіцыраваных, якія хутка растуць, краіне не ўдасца пазбегнуць чарговага лакдаўну. Неўзабаве (з 15 студзеня) у Партугаліі зноў былі ўведзены жорсткі каранцін, па аналогіі з мерамі, якія дзейнічалі вясной. Меры павінны пераглядацца кожныя 15 дзён, аднак Антоніу Кошта дапусціў, што абмежаванні могуць дзейнічаць месяц.

### На мяжы

У мінулым месяцы Цэнтральны банк Партугаліі апублікаваў свой прагноз па эканоміцы краіны. Паводле яго меркавалася, што па выніках мінулага года валавы ўнутраны прадукт скароціцца больш чым на 8 працэнтаў.

Партугальская эканоміка знаходзіцца пад ціскам праблем з-за абмежавальных мер, уведзеных у рамках барацьбы з распаўсюджаннем каранавіруса ў краіне. Згодна з прагнозам Цэнтрабанка, аднаўленне эканамічнай актыўнасці можа распачацца не раней за другі квартал. Мяркуецца, што ў 2021-м і 2022-м эканоміка Партугаліі вырасце на 3,9 % і 4,5 % адпаведна. Але ўсё гэта зноў-такі толькі прагнозы. Міжнародныя арганізацыі ацанілі сітуацыю ў партугальскай эканоміцы яшчэ больш песімістычна. Так, МВФ спрагназаваў падзенне гадавога ВУП па выніках 2020-га на 10 працэнтаў. Еўракамісія і АЭСР чакаюць спаду ў эканоміцы на 9,3 % і 8,4 %.

Сістэма грамадскай аховы здароўя Партугаліі працуе на мяжы магчымасцяў, заявіла міністр аховы здароўя Марта Тэміда, паведамляе Reuters. «Наша сістэма аховы здароўя знаходзіцца ў вельмі цяжкім стане», — канстатавала міністр. Яна дадала, што аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі перапоўнены, паколькі колькасць пацыентаў з COVID-19 рэзка павялічылася. Бальніцы адчуваюць каласальную нагрузку. У Лісабоне пацыентаў прымае палявы шпіталь. У краіне з мінулай пятніцы на 15 дзён закрылі школы. Каб прадухіліць распаўсюджванне брытанскага штама каранавіруса, улады вырашылі прыпыніць авіязносіны са Злучаным Каралеўствам.

Сітуацыя непазбежна адбіваецца на сацыяльнай сферы і эканоміцы краіны. Гэта, у сваю чаргу, сур'ёзна абцяжарвае работу ўрада меншасці. «Пазіцыі прэзідэнта рэспублікі могуць узмацніцца на працягу наступнага тэрміну, калі, напрыклад, паўстане палітычны крызіс, — заўважыў Euronews прафесар паліталогіі Універсітэта Міньё Хасэ Палмейра. — У сітуацыі, калі ўрад павінен змяніцца да заканчэння тэрміну яго паўнамоцтваў і паўнамоцтваў заканадаўчага органа, роля прэзідэнта з'яўляецца асноватворнай. Тады ён выступае ў якасці пасрэдніка ў працэсе фарміравання парламенцкай большасці». Так што 72-гадовы Марселу Рэбелу дэ Соўза застаецца важкай фігурай у палітычнай канфігурацыі Партугаліі. Прысягу прэзідэнт прынясе 9 сакавіка.

**Захар БУРАК.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### З'яўленне новых штамаў ковіду аслабіла эканоміку Еўропы



Як паведамляе CNBC, на фоне новых блакаванняў і абмежаванняў дзелавая актыўнасць у еўразоне зноў пайшла на спад. Сітуацыю ўскладняюць яшчэ апасенні наконт таго, што вакцынацыя ў ЕС будзе ісці недастаткова хутка. У студзені індэкс дзелавой актыўнасці (PMI) упаў да двухмесячнага мінімуму (47,5 пункта), гэта адбылося на фоне ўвядзення ў краінах больш строгіх абмежаванняў з-за COVID-19. Па словах галоўнага эканаміста агенцтва IHS Markit, якое разлічвае гэты індэкс, Крыса Уільямсана, такімі тэмпамі падвойная рэцэсія ў еўразоне становіцца ўсё больш непазбежнай. «Узмацненне жорсткасці абмежаванняў з-за COVID-19 нанесла дадатковы ўрон бізнесу ў студзені», — канстатаваў эксперт.

### У Нідэрландах паліцыя вадамётамі разагнала пратэстоўцаў



Паліцыя ўжыла вадамёты і слёзатачывы газ для разгону дэманстрантаў у Эйндховене, якія выйшлі на акцыю пратэсту супраць новых каранавірусных абмежаванняў, у прыватнасці, увядзення каменданцкай гадзіны. Пратэстоўцы кідалі петарды, рабавалі супермаркеты і білі вітрыны крамаў. У Амстэрдаме прайшлі дэманстрацыі з меншай колькасцю ўдзельнікаў. Больш за 100 чалавек было затрымана. У вёсцы Урк на поўначы краіны быў падпалены цэнтр тэсціравання на COVID-19, паведамілі мясцовыя ўлады. Як адзначыла Бі-бі-сі, у Нідэрландах упершыню пасля Другой сусветнай вайны ўведзена каменданцкая гадзіна — з 21.00 да 04.30. Парушальнікам пагражае штраф у памеры 95 еўра.

### У Кітаі выратавалі 11 шахцёраў



Ратавальнікі ў кітайскай правінцыі Шаньдун паднялі на паверхню 11 чалавек з залатаздабыўной шахты, у якой два тыдні таму адбыўся выбух. У той момант у ёй знаходзіліся 22 шахцёры. Ратавальнікам удалося ўстанавіць кантакт з 12 з іх, адзін з якіх пазней памёр. Першы выратаваны шахцёр знаходзіўся ў цяжкім стане і быў неадкладна дастаўлены ў бальніцу. У выратавальнай аперацыі бралі ўдзел 633 чалавекі і 407 адзінак абсталявання. Прычыны таго, што адбылося, высвятляюцца. У выніку магутнага выбуху ўтварылася 70 тон абломкавых горных парод, якія заблакавалі шахту.

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.
Продавец: **КСУП «Вензовец»** (УНП 500056209), 231488, аг. Вензовец, ул. Новая, 1в, Дятловского р-на Гродненской обл., тел./факс: +375 1563 67-1-21, 67-1-41, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».
Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **11 февраля 2021 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Комбайн свеклоуборочный Kleine SF-10-2, рег. знак СВ-4 0060, 2008 г. в., кузов (рама) № 2310043 | 18 400,00 |
| 2 | Предприятие как имущественный комплекс, сформированный из перечня имущества и имущественных прав, числящихся на балансе коммунального сельскохозяйственного унитарного предприятия «Вензовец» | 7 030 513,26 |

Местонахождение – Гродненская обл., Дятловский р-н, аг. Вензовец, ул. Новая, 2Б. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо в срок** с 27.01.2021 г. 09.00 по 10.02.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газетах «Звязда» от 05.01.2021 г., «Рэспубліка» от 06.01.2021 г.

# ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Дятловоремстрой» (УНП 500056186), объявляет о проведении **05.02.2021 г. в 10.00** публичных торгов в форме аукциона по адресу: г. Минск, ул. Гурского д. 22б, комн. 501
**Предметы торгов:**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Сумма шага аукциона: 5% от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС | Размер задатка: 5 % от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | БЫТОВКА (ОТ ЛАЗЮК) | 229,50 | 11,48 | 11,48 |
| 2 | ВИБРОПЛИТА | 540,00 | 27,00 | 27,00 |
| 3 | ВИБРОПЛИТА RB45-2 | 540,00 | 27,00 | 27,00 |
| 4 | ЕМКОСТЬ ПОД БЕНЗИН | 315,00 | 15,75 | 15,75 |
| 5 | КОМПРЕССОР СО7 | 378,00 | 18,90 | 18,90 |
| 6 | КОМПЬЮТЕР | 67,50 | 3,38 | 3,38 |
| 7 | КОМПЬЮТЕР | 67,50 | 3,38 | 3,38 |
| 8 | КОМПЬЮТЕР | 83,70 | 4,19 | 4,19 |
| 9 | КОМПЬЮТЕР | 67,50 | 3,38 | 3,38 |
| 10 | КОНСТРУКЦИЯ ДЛЯ УСТАНОВКИ НАВЕСНОГО ОБОРУДОВАНИЯ | 1422,00 | 71,10 | 71,10 |
| 11 | КОПИРОВАЛЬНЫЙ АППАРАТ | 90,00 | 4,50 | 4,50 |
| 12 | КРАН-БАЛКА | 2700,00 | 135,00 | 135,00 |
| 13 | КРАН-БАЛКА | 2700,00 | 135,00 | 135,00 |
| 14 | ЛЕСОРАМА С ТЕЛЕЖКОЙ | 1469,70 | 73,49 | 73,49 |
| 15 | ПОДЪЕМНИК С ЭЛЕКТРИЧЕСКОЙ ЛЕБЕДКОЙ | 198,00 | 9,90 | 9,90 |
| 16 | ПОЛУАВТОМАТ СВАРОЧНЫЙ | 360,00 | 18,00 | 18,00 |
| 17 | ПРИСПОСОБЛЕНИЕ ДЛЯ ЗАТОЧКИ РАМНЫХ ПИЛ ЗП-1 | 645,30 | 32,27 | 32,27 |
| 18 | ПУСКОЗАРЯДНОЕ УСТРОЙСТВО | 432,00 | 21,60 | 21,60 |
| 19 | СТАНОК ЗАТОЧНЫЙ | 270,00 | 13,50 | 13,50 |
| 20 | СТАНОК РЕЙСЛУСНЫЙ СР4-1 | 1305,00 | 65,25 | 65,25 |
| 21 | СТАНОК С-25-4 | 2020,50 | 101,03 | 101,03 |
| 22 | СТАНОК СПГ-16 ДОЛБ. | 826,20 | 41,31 | 41,31 |
| 23 | СТАНОК ФРЕЗЕРНЫЙ ФС | 540,00 | 27,00 | 27,00 |
| 24 | СТАНОК ЦДК-5-2 | 1292,40 | 64,62 | 64,62 |
| 25 | ЭЛЕКТРОСТАНЦИЯ | 540,00 | 27,00 | 27,00 |

Местонахождение имущества: г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.
Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.
**Продавец:** ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.
Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.
Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **04.02.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).
Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 26.01.21 по 17.00 04.02.21** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.
Оформление результатов торгов в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Извещение о предыдущих торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 05.12.2020 г.
Затраты на организацию и проведение публичных торгов составили: 00,00 бел. руб. за объявление, аукционный сбор – 7 % от конечной цены предмета торгов.
Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.
Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 443/С-14767 (назначение – здание нежилое, наименование – мойка), общей площадью 5,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 28А;
- капитальное строение, инв. № 443/С-14761 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), общей площадью 20,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 28А/1.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425650100001005353 (целевое назначение – земельный участок для обслуживания мойки и склада), площадью 0,7376 га по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 28А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,2656 га.
**Начальная цена продажи лота 32 520 руб.** (тридцать две тысячи пятьсот двадцать рублей) с учетом НДС.
**Сумма задатка – 3 252 руб.** (три тысячи двести пятьдесят два рубля)

**Условия проведения аукциона:**
1. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.
2. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».
3. Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
4. Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.

Условия оплаты – в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи

**Продавец –** Сморгонский филиал Гроднооблпотребобщества, 231000, г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3, тел. 8-01592-247-82

**Организатор торгов –** Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 26 февраля 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **https://grino.by/aukcion/**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 24 февраля 2021 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71–*
*Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
**https://grino.by/aukcion/**

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.
Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н., г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».
Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **11 февраля 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Комбайн свеклоуборочный KLEINE SF-10-2, 2007 г. в, инв. № 974, рег. знак ГГ5479, Гродненская обл., Дятловский р-н, мехмастерские д. Скипоровичи | 15 200,00 |
| 2 | Комплекс обьектов недвижимости в составе: здание проходной, сооружение дезбарьер, костесборник, здание колбасного цеха, здание консервного цеха, склад инвентаря, склад инвентаря, сооружение благоустройства, отделитель жира, отделитель жира, канализационная сеть, водопроводная сеть, электрические сети, газопровод высокого и низкого давления, расположенный по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Козловщинский с/с, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а | 302 229,52 |
| 3 | Предприятие как имущественный комплекс, сформированный из перечня имущества и имущественных прав, числящихся на балансе коммунального сельскохозяйственного унитарного предприятия «Слава труду» | 7 205 040,89 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.
**Для участия в торгах необходимо в срок** с 27.01.2021 г. 09.00 по 10.02.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газетах «Звязда» 05.01.2021 г., «Рэспубліка» от 06.01.2021 г.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

на строительство объекта
«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича».
г. Минск, ул. Академика Купревича,16.

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

**Застройщик:** ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.
**Юридический (почтовый) адрес:** 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43.
Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – пятница 8.15-15.45, конт. тел.: (017) 3954860, (044) 7771158;
